Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ І ЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня
штодзённая газэта

СУБОТА
9 красавіка 1932 г.
№ 80 (3469)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-76
Сэкратароў 6-15
Начная рэдакцыя . 12-65 (два зваінка)
Выдавецтва . . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на поштах і лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радка нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб згубе і дакументу—2р.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

Т. т. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАЛІНІН і АНДРЭЕЎ аб значэньні і задачах бюро скаргаў (1-ая стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫЯ—Арганізаваць сяўбу ў аднаасобным сэктары! Прыгавор вынесены («Известия»). М. Н. СЯМЁНАВА. Супроць рэвізіі марксызму-ленінізму ў пэдалёгіі (2-ая стар.). А. АЖГІРЭЙ. Цёплы ўспамін на адлежаным фрэнчы, або «Паэзія чырвонаармейца» Р. Казака (3-ая стар.).

Партыйныя ячэйкі МТС абавязаны забясьпечыць поўную гатоўнасьць МТС да сяўбы (2-ая стар.).

Прывітаньні выпускнікам Камуністычнага ўнівэрсытэту Беларусі імя ЛЕНІНА (2-ая стар.).

Ускрыліся рэкі—дарога лесасплаву адкрыта, поўнасьцю вывозьці да сплаўных прыстаней загатоўленую драўніну (3-ая стар.).

Гонар ударнікаў фінфронту—выкананьне 50 проц. пляну другога кварталу да 1-га мая (3-ая стар.).

Да ўсесаюзнай канфэрэнцыі па разьмяшчэньню вытворчых сіл (3-ая стар.).

Пастанова ЦВК і СНК БССР пра рэарганізацыю ВСНХ БССР (4-ая стар.).

Пастанова СНК БССР пра мерапрыемствы для захаваньня маладняка буйнай рагатай жывёлы (4-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ.

Арганізаваць сяўбу ў аднаасобным сэктары!

Да выхаду ў поле засталося літаральна 2-3 пяцідзёнкі. Гэтым самым падрыхтоўка да сяўбы ўступіла ў апошнія рашаючыя дні.

Посьпех сяўбы чацьвёртага завяршаючага году пяцігодкі рашае барацьба за высокія якасныя паказьнікі ў сельскай гаспадарцы,—за павышэньне ўраджайнасьці. Барацьба за высокі ўраджай будзе служыць паказьнікам таго, наколькі тая ці іншая вясковая парт'ячэйка, сельсавет, калгас, калгасная брыгада здольна ажыцьцяўляць баявыя задачы партыі ў сацыялістычнай перабудове земляробства.

Агранавукай і практыкай даказана, што павышэньне ўраджайнасьці залежыць у першую чаргу ад тэрміну сканчэньня ўзорваньня і сяўбы. «КОЖНЫ ЛІШНІ ДЗЕНЬ СПАЗЬНЕНЬНЯ СЯЎБЫ—ПІСАЎ ТАВ. ЯКАЎЛЕЎ,—ЗЬМЯНШАЕ ЎРАДЖАЙ І ЗАБІРАЕ Ў КАЛГАСЬНІКА І Ў ДЗЯРЖАВЫ МНОГА ПУДОЎ ЗЯРНА З ГЕКТАРУ. КОЖНЫ ЛІШНІ ДЗЕНЬ ЗАТРЫМКІ ПАСЕВУ ЯРАВЫХ СТАВІЦЬ У ЗАСУШЛІВЫХ РАЁНАХ ЯРАВЫЯ ПАД УДАР ЗАСУХІ».

РАНЬНЯЕ СКАНЧЭНЬНЕ СЯЎБЫ—ГЭТА ВЫСОКІ ўраджай. За высокі ўраджай ў бягучую веснавую сяўбу мы павінны весьці самую рашучую барацьбу. БАРАЦЬБА ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ—ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ калгасаў.

Забясьпечыць раньняе ўзорваньне і раньняе сканчэньне сяўбы можа толькі вабраякасная падрыхтоўка, поўная гатоўнасьць да выхаду ў поле кожнага калгасу, кожнай вытворчай брыгады і кожнага аднаасобніка.

Між тым, шмат калгасаў і нават саўгасаў яшчэ не гатовы да выхаду ў поле, не забясьпечылі сябе насеньнем, не падрыхтавалі цягавую сілу, не арганізавалі сталых вытворчых брыгад—па сутнасьці не забясьпечылі самых асноўных мерапрыемстваў для пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы. Трэба адзначыць, што іменна ў недаацэнцы брыгад знаходзяцца карэньні ўсіх прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы па калгасным сэктары. Бо там, дзе правільна арганізавана і ўкамплектавана вытворчая калгасная брыгада, дзе брыгада адказвае за вынікі сваёй работы на прымацаваным да яе зямельным вучастку,—там калгасьнікі зацікаўлены ў забясьпечаньні свайго вучастку насеньнем, цягавой сілай і аграмерапрыемствамі, якія падвышаюць ураджайнасьць.

У непрымірымай барацьбе з «левымі» загібамі і правым апартунізмам партыя дабілася вялізарнейшых посьпехаў у сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Калгасная сялянства зьяўляецца зараз цэнтральнай фігурай земляробства—асноўным і галоўным вытворцай сельскагаспадарчай прадукцыі. У бягучую веснавую сяўбу сацыялістычны сэктар павінен засеяць 53 проц. усёй засеянай плошчы.

Аднак, буйная перавага сацыялістычнага сэктару зусім не азначае таго, што астатнія 42 проц. засеўпашчы, якія павінен засеяць аднаасобны сэктар, ня маюць сур'ёзьнейшага эканамічнага значэньня.

У ЦЭЛЫМ РАДЗЕ РАЁНАЎ ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК ІГНАРУЕЦЦА. Амаль па ўсіх раёнах яшчэ ня скончана на давядзеньне пасеўных плянаў у парадку самаабавязацельстваў да бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарак. Кулацка-заможныя гаспадаркі ня ўлічаны і не даведзены да іх цьвёрдыя заданьні па сяўбе. Так, у Барысаўскім раёне па-за калгасамі знаходзяцца яшчэ 62 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія павінны засеяць 52,8 проц. засеўнай плошчы. Аднак, ня гледзячы на гэта ў раёне мы сустракаемся з фактам яўнага ігнараваньня аднаасобнага сэктару. Пляны сяўбы да бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у парадку самаабавязацельстваў і да кулацка-заможных гаспадарак у парадку цьвёрдых заданьняў не даведзены. Ніякай масавай работы па паскарэньні засыпкі страхфондаў у аднаасобным сэктары не праводзіцца. Мы маем і такія факты, што, паасобныя сельсаветы яшчэ не правялі землеўпарадкаваньня, не адвялі зямельныя вучасткі для пасеву аднаасобнікам (Суцінскі сельсавет, Пухавіцкага раёну).

Засыпка страхавых насенных фондаў па аднаасобным сэктары праходзіць надзвычайна дрэнна. Работа па падрыхтоўцы да сяўбы ў аднаасобным сэктары ў радзе месц прадстаўлена самацёку. Плян засыпкі страхавых фондаў па БССР у аднаасобным сэктары выказаны толькі на 12,7 проц.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які разгледзеў пытаньне аб правядзеньні веснавой сельскагаспадарчай кампаніі, прызнаў падрыхтоўчую работу да сяўбы нездавальняючай і асабліва па аднаасобным сэктары.

«ПЛЕНУМ ЗАВАСТРАЕ ЎВАГУ ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІХ і ЗЯМЕЛЬНА - КАЛГАСНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ РАШЭЧАЙ БАРАЦЬБЫ З НЕДААЦЭНКАЙ РОЛІ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ. НЕАБХОДНА ЎЗМАЦНІЦЬ РАБОТУ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ, ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ ІМ, ВЫТВОРЧЫХ ПЛЯНАЎ, ПРАВЯДЗЕНЬНЯ АГРАМЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ПОЎНАГА ВЫКАРЫСТАНЬНЯ ЎСІХ УНУТРАНЫХ МАТАР'ЯЛЬНЫХ РЭСУРСАЎ У ПЭРЫЯД ЗАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ» (З па становы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Вядучы рашучую барацьбу з «лявацкім» ігнараваньнем аднаасобнага сэктару ў падрыхтоўцы да сяўбы, партыйныя, савецкія і зямельна - калгасныя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу з тым, каб дабіцца ў бліжэйшыя-ж дні рашучага пералому ў падрыхтоўцы аднаасобнага сэктару да веснавой сяўбы. Трэба ўзьняць і арганізаваць бядняцка - серадняцкія масы для падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы ў найбольш кароткія тэрміны. Трэба растлумачыць беднякам і сераднякам - аднаасобнікам вялізарнейшае значэньне якасных патрабаваньняў апрацоўцы глебы.

Магутным вагаром у ліквідацыі ўсіх прарываў зьяўляецца генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы. Гэта праверка павінна быць баявым штурмам ліквідацыі ўсіх недахопаў падрыхтоўкі да сяўбы з тым, каб кожны саўгас, кожны калгас і кожны аднаасобнік выхад у поле спаткаў у поўнай гатоўнасьці. Праверка павінна быць глыбока канкрэтнай. Трэба праверыць ня толькі колькасны, але і якасны бок падрыхтоўкі.

Асаблівую ўвагу ў часе праверкі трэба сканцэнтраваць на рашаючых зьвеньнях падрыхтоўкі — на засыпцы насенных фондаў, падрыхтоўцы цягавай сілы, рамонце, і арганізацыі вытворчых брыгад у калгасах.

«ЗБОР НАСЕНЬНЯ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАКОНЧАНЫ ЎСЮДЫ У МАГЧЫМА БОЛЬШ КАРОТКІ ТЭРМІН З ТЫМ, КАБ СВАЯЧАСОВАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ РАНЬНЯЕ СКАНЧЭНЬНЕ СЯЎБЫ І ТЫМ САМЫМ ДАБІЦЦА БОЛЬШ ВЫСОКАГА ЎРАДЖАЮ». (З пастановы Саўнаркому і ЦК УсеКП(б).

Задача генэральнай праверкі заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усе сілы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на завяршэньне засыпкі насенфондаў ў бліжэйшыя дні. Трэба ўсебакова праверыць гатоўнасьць да сяўбы асноўнай цягавай адзінкі — каня. Трэба на справе ліквідаваць абязьлічку ў даглядзе і выкарыстаньні калгаснага каня і мабілізаваць патрэбную колькасьць кармоў для падкорму коняй перад сяўбой і ў часе палявых работ.

Праверка гатоўнасьці да сяўбы павінна мабілізаваць калгасьнікаў і аднаасобнікаў на правядзеньне сяўбы ў найбольш кароткія тэрміны і гэтым самым забясьпечыць асноўную ўмову выкананьня пляну павышэньня ўраджайнасьці.

Трэба перадаць ва ўсе раёны, ва ўсе сельсаветы бліскучы вопыт барацьбы Крычаўскага раёну за арганізацыю сяўбы ў аднаасобным сэктары — вопыт стварэньня на дзесяцідворкі пасўных троек. Праз пасеўныя тройкі трэба дабіцца поўнага выяўленьня кулацка - заможных гаспадарак і своячасова давесьці да іх цьвёрдыя заданьні па сяўбе. І ня толькі давесьці цьвёрдыя заданьні па сяўбе да кулацка - заможных гаспадарак, але і прасачыць за іх выкананьнем.

Адказьнейшыя задачы веснавой сяўбы 4-га завяршаючага году пяцігодкі будуць пасьпяхова выкананы толькі пры мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў і бядняцка - серадняцкага сялянства, на выкананьне плянаў сяўбы, пры ўмове рашучай барацьбы з «левым» і правым апартунізмам, пры ўмове зьнішчальнага адпору нават найменшым спробам клясавага ворага дэзарганізаваць сяўбу.

Прыгавор вынесены

Пасьля двухдзённага пасяджаньня Ваенная калегія Вярхоўнага суда Саюзу ССР закончыла разглядам справу аб замаху на дарадцу германскага пасольства пана фон-Твардоўскага. Абодвы выяўленыя актыўныя ўдзельнікі замаху — І. М. Штэрн, яго саўдзельнік С. С. Васільеў прыгавораны да вышэйшай меры рэпрэсіі—расстрэлу. Працэс працякаў у атмасфэры надзвычайнай палітычнай напружанасьці, таму што і ў гэтым працэсе, як і ва ўсіх буйных працэсах аб контррэвалюцыйных арганізацыях, за сьпінамі выкананўцаў, якія непасрэдна на дзейнічалі, практычных арганізатараў злачынства стаялі сілуэты іншых асоб, ня выяўленых да канца сьледствам, але аб чым удзеле акрэслена гаварылі самі выканаўцы і без дапамогі якіх было аб'ектыўна немагчыма арганізаваць замах.

Ня ўсе з арганізатараў і натхняцеляў замаху засталіся аднак у ценю. Суд устанавіў простую сувязь замаху 5 сакавіка на германскага дарадцу з тэрарыстычнай арганізацыяй, якая натхнялася з-за рубяжу, дзейнічала на тэрыторыі Саюзу яшчэ ў 1928 г. і арганізавала тады ўжо забойства вядомага работніка Чырвонай армії—тав. Шапашнікава і якая ня была выкрыта і ліквідавана тады да канца.

Суд устанавіў простую сувязь арганізатара замаху 5 сакавіка гр. С. С. Васільева з гэтай контррэвалюцыйнай тэрарыстычнай арганізацыяй, і апроч таго, асабістую сувязь таго-ж Васільева ня толькі з непасрэднымі арганізатарамі забойства Шапашнікава, але і простую асабістую сувязь Васільева з галоўным натхняцелем тэрарыстычнай арганізацыі, які дзейнічаў з-за рубяжу — польскім гр-нам Усеваладам Любарскім. Як і ў радзе іншых працэсаў, і ў гэтым справа не абыйшлася без «ускладненьняў». Чорным на белым суд напісаў, што Усеваладам Любарскі, які прыяжджаў у Маскву ў 1928 годзе для арганізацыі тэрарыстычнага акту, вынікам чаго зьявілася забойства Шапашнікава, прыяжджаў у якасьці польскага дыплёматычнага кур'ера. Іменна з ім, з тым дыплёматычным кур'ерам, абіста аказаліся зьвязаныя на арганізацыі тэрарыстычных актаў яго сястра Вольга Шойкава-Паўлоўская-Любарская, уражэнка Польшчы, якая выхоўвалася ў Варшаве да 1914 г.; з гэтым-жа Усеваладам Любарскім аказаўся асабіста зьвязаным другі дзеяч гэтай групы, які ў свой час выпадкова ўнікнуў кары, шватер Дзямідовіча Яўгена — паляк па нацыянальнасьці і які прыняў у 1920 г. польскае падданства на Далёкім Усходзе. У часе заняцьця яго белагвардзейцамі і затым ашуканствам, як грамадзянін СССР служыў у радах Чырвонай армії.

Былы белы афіцэр Квадры, сваякі таго-ж Усеваладa Любарскага — Барыс Любарскі, Леў Любарскі, Ганна Любарская — вось асяродак, на які абапіралася контррэвалюцыйная польска - расійская камарыльля, якая падрыхтоўвала замах, скарыстала афіцыяльныя сувязі і шляхі для сваіх мэт. Але ня ў гэтым аднак палітычная сутнасьць і палітычны цэнтр цяжару судовага працэсу, які закончыўся.

Працэс ускрыў перш за ўсё тое, што актыўнасьць нашых ворагаў з расійска - польскай ваенічны і белагвардзейшчыны ня спыняецца, што ня домыя колы спрабуюць скарыстаць рэшткі контррэвалюцыйных элемэнтаў для сваіх мэт, згрупаваць і арганізаваць іх для шкодніцтва і тэрарыстычных актаў. Суд устанавіў, што не зьмяняліся ні ў чым, ні мэты, ні ороднкі, ні мэтады барацьбы, якія яны ўжываюць.

Мэта — сарваць мірнае сацыялістычнае будаўніцтва нашага Саюзу, справакаваць ваенны, паставіць пад пагрозу ўсе дасягненьні нашай рэвалюцыі і ў крывавым канфліце задушыць, разбурыць маладую сацыялістычную дзяржаву пралетарыяту і ад навіць уладу капіталу і памешчыкаў.

Сродкі — узброеная інтэрвэнцыя ў межы СССР як найбольш сапраўдны з пункту гледжаньня і найбольш надзейны шлях для зьвяржэньня савецкай улады і для гэтага — пагоршаньне і абвастрэньне адносін з капіталістычнымі краінамі, усякая правакацыя разрыву нармальных дыплёматычных зносін.

Мэтад — забойства з-за вугла, правакацыйныя стрэлы, замах на ўзрывы пасольства, страляніна ў паўнамоцных прадстаўнікоў — усё роўна ці на іншых за межамі СССР, ці замежных на тэрыторыі нашага Саюзу.

Малюнак падрыхтоўкі іменна такога характару правакацыйнага забойства пасла Германскай рэспублікі вы крыў толькі - што скончаны працэс. Трэція асобы, якія кіравалі Васільевым, прасьледвалі як-раз мэты разрыву дыплёматычных адносін паміж СССР і Германіяй для палегчаньня ў дальнейшым інтэрвэнцыі. Тымі-ж што раней аказаліся арганізатары, і інспіратары, вопытныя ўжо ў арганізацыі забойстваў і замахаў як на тэрыторыі, так і за межамі Саюзу СССР.

Максымальнае павышэньне палітычнай пільнасьці рабочай клясы і ўсіх працоўных нашага Саюзу — такі першы палітычны вывад, які належыць зрабіць на аснове вынікаў гэтага працэсу.

Пад пагрозу была пастаўлена наша палітыка міру, якую мы праўхільна праводзілі і праводзім. Яшчэ большае павышэньне нашай абароназдольнасьці, яшчэ большае напружаньне намаганьняў, што ўкладаюцца намі ў наша сацыялістычнае будаўніцтва,—такі другі вывад з вурок, які мы павінны для сябе вынесьці.

Гэтым ня вычэрпваецца, аднак, усё значэньне працэсу.

Што ўскрыў працэс з пункту гледжаньня тлумачэньня прычын зьяўленьня да нас Штэрнаў і Васільевых, як папярэдзіць далейшыя магчымасьці іх зьяўленьня?

Штэрн, нікчэмны дэклясаваны прадстаўнік мяшчанскага асяродзьдзя, вузкі, дробязны эгаіст, недалёкі і неразумны; ён уяўляў сябе прыхваным выратаваць «сусьветныя» праблемы, ён зьявіўся вельмі добрым матар'ялам для Васільева, выхадца з буйнай цэнзавай буржуазіі, які стаяў на дзьве галавы вышэй за яго і які на працягу раду год спэцыяльна падрыхтоўваўся памяжнёнай Вольгай Любарскай-Шойкавай да контррэвалюцыйнай работы.

Нізьвергнута ў нас панаваньне буржуазіі, зьнішчаны панаваўшыя эксплёататарскія клясы, але жыве яшчэ ня кучая нянавісьць застаўшыхся абломкаў гэтых клясаў, жыве надзея на магчымую пры дапамозе капіталістычнага свету, рэстаўрацыю ранейшага становішча. Рознымі пчыліязмі карыстаецца клясавы вораг для таго, каб дзе-небудзь зьвіць сабе гняздо, адважваць хоць пядзю, захапіць хоць якую - небудзь пазіцыю.

Працэс паказаў адну з гэтых пазіцый у тэхнікуме Шоўкава і Прамысловa - Эканамічным інстытуце. Адтуль выйшаў Васільеў, выхаваны там старымі выкладчыкамі, лоўкімі інтрыгамі і палітычнымі двурушнікамі. Тут рыхтаваліся кадры «сваёй» моладзі. Другім паставшчыком зьявіліся дэкляваныя адкіды мяшчанства накшталт Штэрна, які шпарка стыкнуўся і вышоўся з Васільевым на глебе «адзінства палітычных поглядаў».

А лоўкія закулісныя рэжысэры, што фігуравалі на працэсе пад імем «трэціх асоб», змаглі ўкласьці ў іх рукі рэвольвэр і накіраваць стрэлы ў прад стаўніка Германіі.

Павышэньне клясавай пільнасьці ўнутры краіны, — такі апошні вывад, які выцякае з разгледжанага працэсу.

Уся краіна наша павінна ўлічыць усе гэтыя тры вывады.

Што-ж тычыцца паноў «польскіх грамадзян» за рубяжом, рускіх белагвардзейцаў там жа і іх саўдзельнікаў у нас унутры СССР, прывілеяваных і непрывілеяваных, дык няхай з гэтага працэсу і прыгавору суда яны зробяць вывад і для сябе.

У нашай краіне, на тэрыторыі нашага Саюзу спробы, падобныя тым, якія зрабілі Штэрн і Васільеў, беспакарана не праходзяць. Жартаваць з нашай палітыкай міру мы не дазволім, і прыгавор суда такі самы, які вынесены Штэрну і Васільеву, будзе вынесены кожнаму, хто паспрабуе хоць у малой меры пайсьці па іх пляху. («Известия»).

Сеньня пачынаецца Усесаюзны пяцідзёньнік агляду работы Бюро скаргаў РСІ

Т. т. Сталін, Молатаў, Калінін і Андрэеў аб значэньні і задачах Бюро скаргаў

Работа Бюро скаргаў мае вялізарнае значэньне ў справе барацьбы за зьнішчэньне недахопаў нашага партыйна-савецкага, гаспадарча-прафсаюзнага і камсамольскага апарату ў справе палепшаньня апарату нашага кіраўніцтва.

ЛЕНІН ГАВАРЫЎ, ШТО БЕЗ АПАРАТУ МЫ ДАЎНО-Б ЗАГІНУЛІ, А БЕЗ СЫСТЭМАТЫЧНАЙ УПАРТАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПАЛЕПШАНЬНЕ АПАРАТУ МЫ НАПЭЎНА ЗАГІНЕМ. Гэта значыць, што рашучая і сыстэматычная барацьба з коснасьцю, бюракратызмам, цяганінай у нашых апаратах зьяўляецца адной з істотных задач партыі, рабочай клясы і ўсіх працоўных нашай краіны.

Вялізарнае значэньне Бюро скаргаў заключаецца ў тым, што яны зьяўляюцца адным з сур'ёзных сродкаў ажыцьцяўленьня наказу Леніна аб барацьбе за палепшаньне апарату. Бюро скаргаў маюць бясспрэчна значныя дасягненьні ў гэтай галіне і задача заключаецца ў тым, каб замацаваць дасягнутыя рэзультаты і дабіцца рашаючых посьпехаў у гэтай справе. Ня можа быць сумненьня, што Бюро скаргаў, згуртоўваючы вакол сябе ўсё больш актыўныя слаі рабочых і калгасьнікаў, уцягваючы іх у справу кіраўніцтва дзяржавай і чула прыслухоўваючыся да голасу працоўных як партыйных, так і беспартыйных—даб'юцца гэтых рашаючых посьпехаў.

Будзем спадзявацца, што пяцідзёньнік па рабоце Бюро скаргаў паслужыць штуршком для далейшага разгортваньня работы Бюро скаргаў, па шляху, які ўказаны нашым настаўнікам—Леніным.

І. СТАЛІН.

***

Ленін нясупынна ўказваў на недахопы нашага дзяржапарату, на неабходнасьць упартай барацьбы з бюракратызмам і цяганінай ва ўсіх нашых органах. Партыя вяла і вядзе гэтую барацьбу, прыцягваючы масы рабочых і працоўных сялян да справы кіраўніцтва. Але бюракратычных скажэньняў у рабоце нашых органаў настолькі яшчэ многа і зло гэта настолькі яшчэ вялікае, што трэба падзесяцярыць барацьбу з імі, барацьбу за палепшаньне нашых органаў, за прыцягненьне да іх работы мас рабочых і сялян.

Бюро скаргаў і рабоча-сялянская інспэкцыя ў цэлым могуць шмат чаго зрабіць у справе перамаганьня бюракратызму, у справе зьнішчэньня фактаў бяздушна-чыноўніцкіх адносін да працоўнага з боку нашага дзяржапарату, з боку яго работнікаў як партыйных, так і беспартыйных. Для гэтага перш за ўсё трэба, каб Бюро скаргаў уважліва адносілася і правяралі масовыя канкрэтныя факты бюракратызму. Іменна на паасобных канкрэтных прыкладах трэба завастрыць гэтую барацьбу. Для гэтага далей трэба, каб праверка гэтых паасобных фактаў ня спынялася на паўдарозе, а абавязкова даводзілася да канца.

Няхай усесаюзны пяцідзёньнік па рабоце Бюро скаргаў дасьць новы штуршок справе барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі ва ўсіх нашых органах.

В. МОЛАТАЎ.

***

Сеньня пачынаецца Усесаюзны пяцідзёньнік агляду работы Бюро скаргаў РСІ.

Рабочая кляса нашай краіны, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дасягнула вялізарных посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку на фронце барацьбы за моцны, гнуткі, савецкі апарат, супроць бюракратызму і цяганіны ў нашых партыйна-савецкіх, гаспадарча-прафсаюзных і камсамольскіх органах.

У гэтай справе галоўную ролю адыгрывалі і адыгрываюць Бюро скаргаў РСІ, якія «зьяўляюцца адным з сур'ёзных сродкаў правядзеньня ў жыцьцё завету Леніна аб барацьбе за палепшаньне апарату» (СТАЛІН).

Шматтысячныя масы працоўных прыцягнуты да кіраўніцтва дзяржавай праз сацыялістычнае сумяшчальніцтва, рабочае шэфства над саўапаратам, праз сэкцыі і дэпутацкія групы саветаў і іншыя формы масавай сувязі работы.

Побач з вялізарнымі посьпехамі ў гэтай справе, у рабоце нашых органаў яшчэ вельмі шмат скрыўленьняў лініі партыі, бюракратычных скажэньняў, цяганіны і расхлябанасьці і «зло гэтае настолькі яшчэ вялікае, што па трэбна падзесяцярыць барацьбу з ім, барацьбу за палепшаньне нашых органаў, за прыцягненьне да іх работы мас рабочых і сялян» (МОЛАТАЎ).

Гэта патрабуе рашучага палепшаньня работы Бюро скаргаў, таму што яны, зьяўляючыся найбольш масавымі органамі Рабоча-Сялянскай інспэкцыі, маюць усе магчымасьці яшчэ больш разгорнута, больш прадуктыўна ўжываць «рознастайныя формы і спосабы кантроля зьнізу, каб паралізаваць усялякі цень скажэньня савецкай улады, каб вырываць паўторна і нясупынна пустазельле бюракратызму» (ЛЕНІН).

Бюро скаргаў РСІ павінны прыцягнуць «усю працоўную масу мужчын і асабліва жанчын» да работы па праверцы выкананьня дырэктыў партыі і ўраду, якая (праверка) зьяўляецца важнейшай формай барацьбы з бюрократызмам таму, што «правяраць людзей, правяраць фактычнае выкананьне справы—у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым цяпер гвоздь усёй работы, усёй палітыкі» (ЛЕНІН).

Пяцідзёньнік, які зараз праводзіцца зьяўляецца масавым аглядам работы Бюро скаргаў, аглядам таго, як яны ажыцьцяўляюць гэтыя дырэктывы партыі і ўраду, наколькі яны выкарыстоўваюць свае вялікія магчымасьці па ўцягненьні шырокіх мас працоўных у непасрэдную барацьбу за карэнные палепшаньне работы нашых органаў, у кіраўніцтве дзяржавай.

Шляхам разгортваньня большавіцкай крытыкі і самакрытыкі трэба выявіць усе недахопы ў рабоце Бюро скаргаў і вызначыць канкрэтныя шляхі для зьнішчэньня гэтых недахопаў, рашучага палепшаньня іх работы. За час пяцідзёньніка Бюро скаргаў павінны абрасьці новым шматтысячным актывам. Пяцідзёньнік зьяўляецца пачаткам штодзённай сыстэматычнай работы па палепшаньні работы Бюро скаргаў.

Аднак, ход падрыхтоўкі да правядзеньня пяцідзёньніка ў БССР сьведчыць аб тым, што ў нас гэта справа не знайшла належнай ўвагі, што ў радзе месц яна апартуністычна недаацэньваецца. Гэта сьвярджаецца тым, што цэнтральны штаб па правядзеньні пяцідзёньніка пры НК РСІ СССР прызнаў нездавальняючым ход падрыхтоўкі па БССР.

Бязумоўна, ні ў якім разе нельга прызнаць здавальняючым тое зьявішча, што толькі 20 з лішкам раёнаў даслалі ў цэнтральны штаб пры НК РСІ БССР зьвесткі аб пачатай падрыхтоўцы. Гэта значыць, што толькі 20 з лішкам раёнаў уключыліся ў падрыхтоўку да правядзеньня пяцідзёньніка, гэта значыць, што большасьць раённых РСІ стаяць у баку ад важнейшых задач, якія вызначаюцца пяцідзёньнікам.

Цэнтральны штаб, які не забясьпечыў належнага кіраўніцтвам раёнамі, а таксама раённыя і гарадзкія КК РСІ, якія не забясьпечылі належнай падрыхтоўкі ў раёнах—цалкам адказваюць за якасьць правядзеньня пяцідзёньніка. Таму яны павінны дамагчыся неадкладнага пералому ў гэтай рабоце.

Прыцягненьне працоўных мас да барацьбы з бюракратызмам, цяганінай і іншымі недахопамі ў рабоце савецкага апарату зьяўляецца адной з важнейшых форм удзелу ў кіраўніцтве дзяржавай. З гэтага пункту гледжаньня пяцідзёньнік, які праводзіцца ЦКК УсеКП(б), НК РСІ і які прысьвечаны ўмацаваньню Бюро скаргаў, дасьць нам магчымасьць яшчэ больш глыбока ўкараніць у сьвядомасьць выказаныя тав. Сталіным думкі аб тым, як трэба ў новай абстаноўцы па-новаму працаваць, па новаму кіраваць.

Посьпехі пяцідзёньніка бязумоўна будуць тым больш значнымі, чым больш у непасрэдную работу Бюро скаргаў будуць уцягнуты перадавыя актывісты з рабочых і работніц, калгасьнікаў і калгасьніц. На выкананьні гэтай задачы і трэба завастрыць зараз увагу як партыйных так і савецкіх органаў па мясцох, а таксама ўвагу цэнтральнай і мясцовай прэсы.

Вельмі важным бокам гэтага пяцідзёньніка зьяўляецца задача—наладзіць правільную пастаноўку работы і самых Бюро скаргаў, што будзе спрыяць яшчэ большаму ўцягненьню ў работу шырокіх рабочых мас. У гэтым пытаньні вялікае значэньне мае падыход да абсьледвацельскай работы, якая праводзіцца Бюро скаргаў. Мне ўяўляецца, што ў абсьледвацельскай рабоце Бюро скаргаў першаступнёвым зьяўляецца ня толькі і ня столькі самы факт выкрыцьця вінаватага таго ці іншага недахопу (хоць і гэта важна), колькі выяўленьне прычын, якія спрыяюць узьнікненьню гэтых недахопаў і, што асабліва важна, гэта выяўленьне магчымасьцей зьнішчэньня гэтых недахопаў такім шляхам, які забясьпечыў-бы вялікае палепшаньне ў рабоце і выключыў-бы ўзьнікненьне гэтых недахопаў. Бязумоўна, што такі падыход у абсьледвацельскай рабоце больш цяжкі, чым адно выяўленьне факту таго ці іншага недахопу, але затое такі падыход забясьпечвае работнікам Бюро скаргаў і актыву, прыцягнутаму да гэтай работы, больш шырокія магчымасьці сапраўды змагацца за палепшаньне савецкага апарату.

М. КАЛІНІН.

***

Бюро скаргаў зьяўляецца, амаль што, найбольш важным органам у сыстэме РСІ, іх работа для партыі мае надзвычай вялікае значэньне.

Праз гэтыя органы праходзяць дзесяткі тысяч скаргаў рабочых і сялян. Гэта багацьцем матар'ял з пункту гледжаньня таго, каб мяркаваць па ім аб тых недахопах, якія маюць месца на прадпрыемствах прамысловасьці, у калгасе, у савецкім апараце. Таму добра пастаўленая работа Бюро скаргаў можа сьпіталізаваць нам аб «неблагополучии» на тым ці іншым вучастку нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы зараз ужо працуем у такой абстаноўцы, калі галоўнейшыя пытаньні ў адносінах да правільнай пабудовы савецкага і гаспадарчага апарату і іх работы зьяўляюцца не агульныя пытаньні, а канкрэтная барацьба з паасобнымі недахопамі і перанесеньне добрага, удалага вопыту на ўсю сыстэму савецкай і гаспадарчай работы. Трэба толькі дабіцца ў работы Бюро скаргаў таго, каб ні адна скарга не засталася не разгледжанай, а з другога боку трэба, каб уся работа Бюро скаргаў насіла масавы характар і каб да праверкі і разгляду матар'ялаў, што паступаюць у Бюро скаргаў, прыцягваліся-б шырокія масы рабочых і калгасьнікаў. У гэтым сэнсе работа гэтых органаў РСІ мае вялізарнае сацыялістычнае значэньне.

А. АНДРЭЕЎ.

***

Правядзеньне пяцідзёньніка ў БССР працягнута да 20 красавіка

Пастанова Прэзыдыуму ЦК ККП(б)Б

У зьвязку з недапушчальна-марудным падрыхтоўкай мясцовых КК РСІ да правядзеньня з 9 па 14 красавіка г. г. усесаюзнага пяцідзёньніка па агляду работы Бюро скаргаў, Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Правядзеньне пяцідзёньніка па рабоце Бюро скаргаў працягнуць да 20-IV г. г., абавязаўшы ўсе КК РСІ і штабы зараз-жа разгарнуць баявую падрыхтоўку і правядзеньне пяцідзёньніка, забясьпечыўшы поўнае і своячасовае выкананьне пастаноў ЦКК НК РСІ СССР і БССР і сакавіковага пленуму ЦКК КП(б)Б па гэтым пытаньні.

2) Абавязаць КК РСІ і Райштабы да 15-IV г. г. прадставіць штабу пры НК РСІ БССР інфармацыйныя зводкі аб падрыхтоўцы і ходзе правядзеньня пяцідзёньніка.

3) Для практычнай дапамогі і ўзмацненьня работы па правядзеньні пяцідзёньніка мабілізаваць і накіраваць ў групу раёнаў інструктароў ЦКК НК РСІ, адначасова прапанаваўшы КК РСІ і штабам зараз-жа накіраваць групу т. т. па паасобных сельсаветах, калгасах і саўгасах.

4) Прапанаваць усім КК РСІ абагуленыя вынікі пяцідзёньніка прадставіць у штаб пры НК РСІ БССР не пазьней 25-IV г. г.

Нам. Старшыні ЦКК КП(б)Б
Жолудаў.

ЗА ГРАНІЦАЙ

ТЭРОР УЗМАЦНЯЕЦЦА

ШАНХАЙ, 7. Кітайскія ўлады аддалі загад аб арышце ўдзельнікаў чапэйскага ўраду. У кітайскай часьці гораду расклеены аб'явы, у якіх гаворыцца, што кітайскі муніцыпалітэт ня будзе прызнаваць ніякіх дзеяньняў, якія прадпрыняты незаконнай арганізацыяй. У загадзе аб арышце пр

Партыйнае будаўніцтва

Партыйныя ячэйкі МТС абавязаны забясьпечыць поўную гатоўнасьць МТС да сяўбы

Кінуць сілы на рашаючыя вучасткі

З кожным днём мы ўсё бліжэй і бліжэй падыходзім да пачатку сяўбы.

У надыходзячую веснавую сяўбу выключна важную ролю будуць адыгрываць МТС. Партыя і ўрад на справу арганізацыі МТС і на іх практычную работу зьвяртаюць вялікую ўвагу, што вынікае з тых вялікіх адказьнейшых задач, якія ўскладзены на МТС у рабоце па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, на аснове яе калектывізацыі, на аснове тэхнічнага ўзбраеньня калгаснай вытворчасьці.

Усім вопытам сваёй работы МТС ужо давялі, што яны поўнасьцю спраўляюцца з ускладзенымі на іх задачамі. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, ідуць упередзе астатніх, як у галіне падвышэньня ўраджайнасьці, так і ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і па ўсіх астатніх відах сельска-гаспадарчых работ. МТС таксама паказалі бліскучыя прыклады ў выкананьні гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў, якія праводзіліся партыяй і ўрадам на вёсцы.

Зараз МТС стаяць перад вырашэньнем адной з адказьнейшых задач—перад правядзеньнем веснавой сяўбы. МТС БССР у гэтую вясну павінны асвоіць 600,000 га зямлі, пры гэтым па вінна быць забясьпечана значнае павышэньне ўраджайнасьці, павінны быць поўнасьцю захаваны вызначаныя партыяй тэрміны. Гэтым вызначаецца тая вялікая работа, якая павінна была быць разгорнута партыйнымі ячэйкамі МТС у справе падрыхтоўкі да сяўбы.

БССР прыступае да веснавой сяўбы пры значна пашыранай сетцы МТС, пры папаўненьні ўжо існуючых як трактарамі, так і прычэпным інвэнтаром, пры наяўнасьці большай сеткі і лепш абсталяваных рамонтных майстэрань, значным павялічэньні колькасьці неабходных кадраў і г. д., што стварае ўсе неабходныя прадпасылкі для сваячасовага і пасьпяховага правядзеньня сяўбы на тэрыторыі, якая абслугоўваецца МТС.

Аднак, гэта ні ў якім разе не азначае, што партыйныя ячэйкі і кіраўніцтва МТС могуць спадзявацца на самацёк, не разьвярнуўшы самай шырокай работы па падрыхтоўцы да сяўбы.

Да пачатку сяўбы застаюцца літаральна лічаныя дні. Між тым далёка ня ўсе падыходзяць да сяўбы ў поўнай баявой гатоўнасьці, што зьяўляецца вынікам слабасьці, а часамі і поўнай адсутнасьці работы партыйных ячэек, адсутнасьці штодзённага кіраўніцтва работай МТС.

Партячэйкі Сіроцінскай, Барысаўскай і раду іншых МТС не забясьпечылі апэрацыйнага кіраўніцтва ходам падрыхтоўкі да сяўбы і ў выніку—у гэтых МТС яшчэ не адрамантаваны ні трактарны парк, ні прычэпны інвэнтар, яшчэ не заключаны дагавары з калгасамі, яшчэ не аформлены вытворчыя вучасткі і г. д. Зусім зразумела, што такое становішча патрабуе ад партыйных ячэек гэтых МТС нама ганьня ўсіх сіл, разгортваньня самай шырокай работы па мабілізацыі ўсіх рабочых і тэхнічнага пэрсаналу для неадкладнай ліквідацыі прарыву.

Партыйныя ячэйкі астатніх МТС абавязаны неадкладна арганізаваць шырокую праверку таго як яны гатовы да выхаду ў поле, выявіць і зьнішчыць усе слабыя месцы.

Асноўны ўпор павінен быць зроблены на рашаючыя вучасткі падрыхтоўкі да сяўбы. У бліжэйшыя дні поўнасьцю скончыць рамонт трактарнага парку і ўсяго інвэнтара, забясьпечыўшы неабходным запасам гаручага, заключыць умовы з калгасамі, неадкладна прыступіць да афармленьня вытворчых вучасткаў і адпаведнай разьбіўкі цягавай і людзкой сілы, на гэтым павінна быць зараз сканцэнтравана ўся ўвага партыйных ячэек МТС.

Узьняць тэмпы рамонту трактароў

Клімавічы. (Наш кар.). Баявая падрыхтоўка да 3-й бальшавіцкай сяўбы на Клімавіцкай МТС яшчэ не разгорнута. З 42 трактароў адрамантавана толькі 38. Якасьць рамонту надзвычайна нізкая. Майстэрня пры МТС працуе з перабоямі. Трэба было адрамантаваць 3372 плугоў, але адрамантавана толькі 2.000 Калёс з 1963 ад рамантавана 650 шт. Шмат яшчэ не адрамантавана дробнага інвэнтара.

Пры такіх тэмпах работы ёсьць пагроза, што МТС выйдзе сёньня непадрыхтаванай. Каб папярэдзіць гэтае становішча трэба ў час правадзімай масавай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы ўзьняць работу брыгад па рамонце і разгарнуць паміж імі сацыялістычнае спаборніцтва.

Кожны дзень падрыхтоўкі да вясны павінен быць ударным.

Т. Кавалёў.

Партячэйка не ўзначальвае падрыхтоўку да сяўбы

Пастанова партыі і ўраду аб скансалідаваньні ремонту трактароў, с.-г. машын і інвэнтара да 1 сакавіка—Сіроцінскай МТС ня выканана. Трактарны парк цалкам не адрамантаваны. Паводле пляну трэба адрамантаваць 28 шт. трактароў капітальным рамонтам і бягучым—1, а адрамантаваны ўсяго толькі 11.

Яшчэ да гэтага часу не адрамантаваны 4 дыскавых бараны, 8 сеялак і значная колькасьць барон «Зіг-Заг». МТС запрымлівае рамонт калгаснага с.-г. інвэнтара. Ня прыведзены ў баявую гатоўнасьць 407 плугоў і 16 культываратароў, 582 бараны і 2 сеялкі.

У выніку недастаткова праведзенай работы сярод калгаснікаў, якія абслугоўваюцца МТС, рамонт інвэнтара ў калгасах зацягваецца. Калгасу «Чырвоная Маёраўшчына», Шумілаўскага сельсавету, патрэбна адрамантаваць 8 плугоў, а не адрамантавана півод нага.

Гэткае становішча з рамонтам атрымалася ў выніку таго, што брыгады па рамонце ня складзены. Зьдзелічына злачынна ігнаруецца. Дырэктыў МТС нават не ўстаноўлены расцэнкі на рамонт асобных частак, дэталяй. Аплата ўпярэдцца надзённа, а ня зьдзельна. На якасьць і колькасьць зробленай работы належнай увагі не зварочваецца.

6 умоў тав. Сталіна сярод трактарыстаў ня толькі не ўжываюцца, а нават не прапрацаваны. Трактары не замацаваны за пасобнымі трактарыстамі. Адрамантаваны інвэнтар захоўваецца нядбайна, валяецца на дворе, занесены сьнегам.

Дырэктыву партыі аб падрыхтоўцы адпаведных кадраў да веснавой пасеўнай кампаніі МТС ня выконвае.

Паводле пляну патрэбна было прапусьціць праз курсы старшых рулявых 26 чал. а прапушчана толькі 14.

Курсы малодшых трактарыстаў укамплектаваны на 88 чалавек, замест патрэбных паводле пляну 260 чал. У пунктах Сіроціна і Лоўжа курсы трактарыстаў сарваны і працуюць толькі ў адным пункце (Шумілінa). Падрыхтоўка да правядзеньня курсаў машынаведаў (на 400 чал.) і па ляводаў (60 чал.) не пачата. Партыйная ячэйка на чале з сакратаром Аксельродам таксама пішах мер да наладжваньня работы і поўнага ўкамплектаваньня курсаў ня прымае.

Засыпка насенных і страхавых фондаў ідзе марудна. Плян па аўсе выкананы на 80 проц., бабовых культур —57,5, лёне—на 46 проц., віцы—48,7. Ачыстка насеньня далёка ня скончана.

Трэба таксама адзначыць, што складаньне вытворча-фінансавага пляну МТС на 1932 г. яшчэ нават і не пачаўся, ня гледзячы на тое, што тэрмін ужо даўно мінуў. Па калгасах складзена замест патрэбных 48—толькі 22 пляны.

Такое становішча тлумачыцца тым, што партыйная ячэйка на МТС ня стала на чале падрыхтоўкі да сяўбы. На бюро і сходах ячэйкі гэтым пытаньнем зусім не займаліся. Палітыка-масавая работа сярод рабочых МТС адсутнічае. Важнейшыя пастановы партыі і ўраду аб чарговых задачах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, аб арганізацыі працы ў калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, не прапрацаваны

П. Х.

Навярстаць упушчаны час

Барысаў. (Наш кар.). МТС не разгарнула бальшавіцкай барацьбы за свячасовую падрыхтоўку да сяўбы.

Насенныя фонды ў 47 замацаваных за МТС калгасах засыпаны ўсяго на 62,1 пр. Насеньня бульбы ёсьць усяго 34 проц. пляну, ня гледзячы на тое што раён мае бульбяна-крывёлага доўчы напрамак.

Насеньня траў, якія таксама маюць вялікую ўдзельную вагу ў пасеўных плянах раёну, засыпана ўсяго на 14 проц. Ачышчана насеньня ўсяго 41 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што МТС не змагаецца за правядзеньне прасьцейшых апратэхнічных мерапрыемстваў за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

МТС вельмі марудна праводзіць заключэньне дагавораў з калгасамі на абслугоўваньне іх с.-г. машынамі і апрацоўку зямлі.

З 47 калгасаў заключылі дагаворы толькі 33. Вытворча-фінансавыя пляны складзены ўсяго ў 18 калгасах. Якасьць прапрацоўкі вытворча-фінансавых пляноў зусім дрэнная; гэта тлумачыцца тым, што вакол гэтага не разгорнута масавая работа.

Кіраўніцтва Барысаўскай МТС, у аснову падрыхтоўкі да сяўбы не пакласьці ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсесКП(б) ад 4-га лютага аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. МТС зусім не займаецца пытаньнем арганізацыі брыгад у калгасах і ўстаноўленьнем норм зьдзельнай аплаты працы ў час веснавой сяўбы.

Партыйная ячэйка МТС павінна зараз-жа забясьпечыць такія тэмпы работы па засыпцы насенфондаў, заключэньні дагавораў з калгасамі і арганізацыі калгасных брыгад, каб навярстаць упушчанае і сусьпрацоць вясну падрыхтаванай.

С.

Танежыцкая МТС ударна рыхтуецца да сяўбы

Чырвоная Слабада. Танежыцкая МТС па-бальшавіцку рыхтуецца да трэцяй бальшавіцкай. З усіх МТС БССР яна першай закончыла рамонт усяго трактарнага парку і прычэпнага інвэнтара. МТС цалкам забясьпечана гаручым і змазачным.

МТС ужо заканчвае рамонт с.-г. інвэнтара ўсіх калгасаў, якія яна абслугоўвае.

Для дапамогі ў рабоце адстаючым МТС Танежыцкая МТС выручыла 7 ударнікаў, якія накіраваны на месца работы.

Добра арганізавана падрыхтоўка кадраў. Ужо закончылі сваю работу курсы старшых рулявых, якія выпусьцілі 20 чалавек. Зараз арганізаваны курсы паляводаў, на якіх навучаецца 44 асобы.

Кіраўніцтва МТС правяло вялікую работу па складаньні фінансава-вытворчых пляноў у калгасах.

А. Жук.



Брыгады калгасьнікаў правяраюць сваю гатоўнасьць да сяўбы.

Бальшавіцкае прывітаньне выпускнікам КАМВУЗУ ІМЯ ЛЕНІНА

Яшчэ атрад бальшавікоў, узброеных марксыцка-ленінскай тэорыяй

Камвуз Беларусі імя Леніна выпускае новы атрад бальшавікоў, узброеных марксыцка-ленінскай тэорыяй, гатовых біцца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б Камвуз правёў значную работу па зьнішчэньні недахопаў, якія былі выкрыты Ц. О. нашай партыі «Правдой» і прыступіў да перабудовы работы па-новаму на аснове пастановы ЦК КП(б)Б.

Перад Камвузам стаяла задача канчаткова выкарчаваць з выкладаньня ўплывы клясава-варожых пралетарыяту ідэалёгій, як рубінштыну, дэборынштыну і інш. Неабходна было шчыльна зьвязаць тэарэтычныя дысцыпліны з праблемамі сучаснасьці, з праблемамі сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны.

Старыя праграмы ня зусім адпавядалі вышэйшым задачам, і новы вучэбны год пачаўся на падставе перабудовы большасьці праграм. Камвуз паклаў у аснову сваёй работы 6 гістарычных умоў тав. Сталіна ў іх пераламленьні да абстаноўкі Камвузу. Ліст т. Сталіна ў часопіс «Пралетарская рэвалюцыя» зьявіўся вагаром новага наваароту ў рабоце Камвузу і ўзьняцьця яе на вышэйшую ступень. У барацьбе супроць трацкісцкай кантрабанды, супроць гнілога лібералізму да таго, якую рашуча праводзіла наша партыя, прымаў значны ўдзел і Камвуз Беларусі. Завостраная пільнасьць студэнтаў і выкладчыкаў дала магчымасьць выпрыць рад прынцыповых памылак з боку пасобных выкладчыкаў (Поташ, Мазель) і поўнасьцю зразумець сутнасьць канкрэтных правых ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму (Выдра, Вальфсон), які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на гэтым этапе, і ў бок мяшчоўнага шавінізму. Камвуз прыступіў да перагляду ралу праграм у сьвятле ліста т. Сталіна. Ужо пераглядзана праграма па гісторыі УсесКП(б) у нагадоўку большай партыйнай непрымірымасьці, рашучай барацьбы са скажэньнямі ролі бальшавізму, які быў адзіным пасьля доўным барацьбітом супроць апартуністаму розных колераў на ўсім II Інтэрнацыяле, ролі люксэмбургізма, як паўцэнтрыскай плыні, якая змагалася супроць ленінізму па карэнных праблемах рэвалюцыі.

Студэнты Камвузу злучалі тэарэтычную працу з актыўным удзелам у палітычна - гаспадарчых кампаніях, якія праводзіцца партыяй.

Нельга, аднак, не адзначыць, што Камвуз яшчэ цалкам не перабудаваў сваёй работы ў адпаведнасьці з баявымі чарговымі задачамі партыі і не розлізаваў поўнасьцю лёзунгу партыі «працаваць і кіраваць па-новаму». На гладзецца яшчэ значная цяжучасьць кіруючых работнікаў Камвузу—загадчыкаў аддзяленьняў, габінэтаў і катэдраў. Прапагандысцкі габінэт зусім яшчэ ня створаны, што не дае магчымасьці сыстэматычна кіраваць прапагандысцкай работай студэнтаў у нізавых зьвеньнях партсаўдзеты. Слаба яшчэ працуюць і іншыя габінэты—як партыйны і савецкі. Катэдры яшчэ не ператварыліся поўнасьцю ў лябарагорыі марксыцка-ленінскага выхаваньня і не забясьпечваюць сыстэматычнага кіраўніцтва работай кожнага работніка катэдры. Кіраўніцтва ўсімі зьвеньнямі вучобы яшчэ недастаткова жывое, аператыўнае і чоткае.

Пры вялікай ўдзельнай вазе практычнай працы студэнтаў ва ўсёй іх рабоце, Камвуз яшчэ не дабіўся лоб рага кіраўніцтва бягучай практычнай работай, якая адбываецца ў час вучобы.

Перад Камвузам стаіць задача ліквідацыі гэтых недахопаў, узьняцьця тэарэтычнай і практычнай работы студэнтаў на той узровень, які вымагаецца па сучасным этапам заканчэньня першай пяцігодкі і другой пяцігодкай,—пяцігодкай пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Сучасны момант выпуску супадае для Камвузу з адказнай задачай—укамплектаваньнем веснавым наборам. Партыя ня можа здавальняцца пры вострай патрэбе ў партыйных кадрах той невялікай колькасьцю студэнтаў цяперашняга выпуску (70 чал.).

У апошні набор, увосень 1931 г., тэмпы камплектаваньня павялічыліся ў 6 разоў у параўнаньні з наборам увосень 1929 г.

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б наборы ў Камвуз адбываюцца 2 разы ў год: увосень і ўвесну. Зараз Камвуз павінен набраць 150 чал., і перад Камвузам, перад Райкомамі і Гаркомамі КП(б)Б стаіць баявая, неадкладная задача выканаць заданьні па камплектаваньні ў колькасных і якасных адносінах.

Партыя чакае ад Камвузу падрыхтоўкі і выхаваньня бальшавікоў, адольных у непрымірымай барацьбе супроць апартунізму розных колераў, упарта ажыцьцяўляць баявыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Невялікі па колькасьці атрад студэнтаў, узброеных марксыцка-ленінскай тэорыяй, павінен давесьці на практыцы, што Камвуз выпускае не начотчыкаў ад марксызму, а бальшавікоў, стойкіх барацьбітоў за сацыялізм.

Камвузаўцы павінны апраўдаць надзею, якая ўскладаецца на іх партыяй.

Агульнік.

Прывітаньне ЦК КП(б)Б выпускнікам КУБ імя Леніна

Рады барацьбітоў за генэральную лінію партыі папаўняюцца новымі атрадам, узброеным марксызмам-ленінізмам.

Ваш выпуск саўпадае з момантам, калі рабочая клясна над кіраўніцтвам партыі, пасьпяхова завяршае 1-ю пяцігодку і намеціла сусьветную гісторычную праграму пабудовы сацыялізму ў 2-й пяцігодцы.

Пад кіраўніцтвам ЦК УсесКП(б) на чале з т. СТАЛІНЫМ, партыя ідзе ад перамогі да перамогі.

Упередзе ня «плаўны» шлях разьвіцьця. Клясы ліквідуюцца ў клясавай барацьбе і ў барацьбе з апартуністамі розных колераў. Новая абстаноўка патрабуе кіраваць па-новаму.

Усе сілы, усю энэргію на пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Высока трымайце сьцяг Леніна, імя якога нясе Ваш Камвуз.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч

Прывітаньне Гаркома 8 выпуску КУБ

Новаму атраду бальшавіцкіх кадраў у барацьбе за генэральную лінію партыі — 8-му выпуску КУБ ад імя Менскага Гаркому КП(б)Б — бальшавіцкае прывітаньне.

Аўладаўшы мацнейшай зброяй пралетарыяту — марксызмам - ленінізмам, з патрэбнай энэргіяй і бальшавіцкай напорыстасьцю — на барацьбу за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за грандыёзныя задачы 2-й пяцігодкі — пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва — уперад!

Сакратар Гаркому КП(б)Б Шпэктараў.

Горача вітаю выпуск Камвузу 1932 г.

Рыхтуючы новыя камуністычныя кадры для БССР, Камвуз імя У. І. ЛЕНІНА вырашае адну з важнейшых задач клясавай барацьбы, барацьбы за сацыялізм—задачу кадраў. Новы выпуск Камвузу павялічвае колькасьць высока-кваліфікаваных, узброеных тэорыяй і практыкай марксызму-ленінізму кадраў у КП(б)Б і яшчэ больш узброівае Савецкую Беларусь для пераможнага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

Горача вітаю выпуск Камвузу 1932 г., выказваю ўпэўненасьць, што заняўшы камандныя апорныя пункты па заданьні партыі, выпускнікі з гонарам будуць выконваць свае абавязкі ў барацьбе за канчатковую перамогу сацыялізму. Уперад, на працу, на барацьбу, на аснове генэральнай лініі партыі.

А. Чарвякоў.

Студэнтам-выпускнікам Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя У. І. Леніна

Вітаю выпускнікоў Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя У. І. ЛЕНІНА. Па скончэньні Унівэрсытэту партыя накіроўвае Вас на адказную працу на розных галінах партыйнага і савецкага будаўніцтва.

Мы канчаем першую пяцігодку, прыступаем да складаньня 2-й пяцігодкі, якая адчыняе новую старонку ў гісторыі чалавецтва на шляху пабудовы бясклясавага грамадзтва.

Упоўнены ў тым, што марксыцка-ленінскую тэорыю, якую набылі ў Камвузе, Вы злучыце з практыкай і будзеце актыўнымі ўдзельнікамі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, па-бальшавіцку змагаючыся за ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. СТАЛІНА. Ва ўсёй Вашай працы будзеце весьці самую рашучую і бязьлітасную барацьбу з усякімі ўхілам ад генэральнай лініі партыі.

Жадаю посьпехаў у працы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР Галадзед.

М. Н. Сяменава

Супроць рэвізіі марксызму-ленінізму у пэдалёгіі

Пераважнай формай рэвізіі марксызму ў пэдалёгіі зьяўляецца мэханіцызм, які нярэдка пераплятаецца з элемэнтамі ідэалізму. У першую чаргу трэба выкрыць гэтую мэханістычную тэндэнцыю, якая зараз прадстаўляе сабою галоўную небясьпеку, не зьмяншаючы адначасова барацьбы з правымі ідэалізму.

Пры наяўнасьці антымарксыцкіх тэорый і іх носьбітаў ва ўмовах Беларусі, таварыства марксыстаў пэдагогаў і філёсофаў амаль нічога яшчэ не зрабіла ў напрамку выкрыцьця іх тэорый. Адна з такіх мэханістычных плыняў узначальваецца ў БССР праф. Сарахціным. У сваіх літаратурных працах праф. Сарахцін падмяняе мэтад дыялектычнага матар'ялізму мэтадам спалучальных рэфлексаў, што азначае простае рэфлексалёгізаваньне марксызму.

Выступленьне яго на старонках часопісу «Камуністычнае Выхаваньне» № 9 з прызнаньнем сваіх памылак ні ў якім разе нельга лічыць здавальняючым. Наадварот, яно паказвае на неабходнасьць бальшавіцкай крытыкі ўсіх прац Г. Н. Сарахціна, яго антымарксыцкіх поглядаў, якія найяскравей выявіліся ў тэзісах «Прадмет і мэтад рэфлексалёгіі». Таксама падлягаюць крытыцы і такія яго працы як «Рэфлексалёгічныя тыпы», «Пабудова і работа чалавечага цела».

Ня ставячы зараз мэтай дакладны разбор апошняй—нельга ня спыніцца на прадмове аўтара да гэтай кніжкі. Аўтар зводзіць ў ёй чалавека проста да машыны:

«Чалавек павінен разглядацца як машына, чым у корані разрушаецца погляд на жыцьцё, як на нешта асаблівае, якое стаіць па-за законамі фізікі і хэміі» (12 стар.).

Сарахцін у гэтай працы перапявае французкіх матар'ялістаў XVIII стагодзьдзя, у прыватнасьці Ляметры, які таксама ня бачыў якаснай розьніцы паміж чалавекам і машынай, і зводзіў чалавека да жывёлы. Сарахцін пераносіць мэханічны матар'ялізм XVIII ст. з усімі яго недахопамі да нашай эпохі. У яго—адзіна рэвалюцыйная тэорыя Маркса—Энгельса—Леніна падмяняецца анты-дыялектычным матар'ялізмам, адмаўляючым актыўную сацыяльна - клясавую дзейнасьць чалавека і ўплыў яго на фармаваньне псыхафізіялёгіі. Заснавальнікі марксызму кажуць, што рухаючыя сілы разьвіцьця знаходзяцца ў грамадзтве. Гэта яе вытворчыя сілы, якія ёсьць—супольнасьць жывой і мёртвай працы: супольнасьць тых сіл, які мі чалавек дзейнічае ў працэсе вытворчасьці, якія чалавек, пры дапамозе тэхнічных прыстасаваньняў, актывізаваў. Як жа ён—чалавек, зможа дзейнічаць паводле Сарахціна, калі ён машына, калі не чалавек дзейнічае, але навакольнае асяродзьдзе фармірує і зьмяняе гэтую машыну? Такі погляд дзейнасьць чалавека зводзіць да прасьцейшай трансфармацыі энэргіі раздражэньня ў энэргію руху.

Гэта тэорыя раўнавагі ў пэдалёгіі ня вытрымлівае ніякай крытыкі, як і ў іншых навуках. Асноўная думка гэтай тэорыі заключаецца ў тым, што сьвет прадстаўляе сабой спалучэньне мэханічных сыстэм, рухі якіх абумаўляюцца сутыкнай зьнешніх сіл, накіраваных адна супроць адной. Часамі гэтыя сілы ўраўнаважваюць адна адну, тады наступае стан раўнавагі-пакою, які будзе працягвацца да той пары, пакуль якая небудзь сіла, што праходзіць зьне, не парушыць гэтай раўнавагі, тады наступае перагрупоўка элемэнтаў давай сыстэмы, якая ўстанаўляе новую раўнавагу на новай сыстэме пры іншым злучэньні сіл. Згодна гэтай тэорыі, замест унутраных супярэчнасьцей—зьнешняе процідборства, замест самаруху—знадворны штурпшок, замест дыялектычнага адмаўленьня і адмаўленьня адмаўленьня,—парушэньне раўнавагі і ў якасьці сінтэзу новая раўнавага. Такім чынам арганізм,—гэта замкнутая сыстэма, якая ня мае ў сабе ўнутраных супярэчнасьцей, а крыніцай руху зьяўляецца антаганізм зьнешніх сіл, зьнешняя сила парушае гармонію арганізму.

І Маркс, і Энгельс, і Ленін у аснову разуменьня разьвіцьця клалі ня раўнавагу, не пакой, а самарух, як вынік унутраных супярэчнасьцей, а таксама супярэчнасьцей з асяродзьдзем. Яны разглядалі раўнавагу як форму выяўленьня руху. «У жывым арганізме мы наглядаем нібы пастаянную раўнавагу ўсяго арганізму, якая аднак, заўсёды знаходзіцца ў руху: мы наглядаем тут жывое адзінства руху і раўнавагу». З пункту гледжаньня тэорыі раўнавагі апошняя азначае такі момант, калі ў працэсе няма ўнутраных супярэчнасьцей, таму-жа і рух працэсу да моманту зьяўленьня супярэчнасьцей магчымы толькі ў моц зьнешніх прычын. У тэорыі раўнавагі мы маем яскравы і сканцэнтраваны выраз мэханістычнага, антыдыялектычнага сьветапогляду, тут мы маем зьвядзеньне якасьці да колькасьці, маем зьвядзеньне працэсаў чалавека да працэсаў няжывога.

Цікава, што пішучы аб сваіх уласных памылках і будучы вучнем Бехцерава, Сарахцін ня толькі ня даў дастатковай крытыкі школы Бехцерава, але таксама і сваіх уласных памылак. Рэфлексалёгія Бехцерава зьяўляецца груба мэханістычнай, яна імкнецца «аб'ектыўным» шляхам вывучаць паводзіны чалавека (суадносную дзейнасьць чалавека), адрашэньнем усяго зямнога і людзкога: «Для таго, каб стаць на строга аб'ектыўны пункт гледжаньня ў адносінах да чалавека, уявеце сябе, у становішчы істоты другога сьвету і другой прыроды, якая апусьцілася да нас, скажам, з іншай планэты» (Бехцераў, Калектыўная рэфлексалёгія). Вось гэта зьнешняе паазярхоўнае і мэханістычна-ідэалістычнае прымаец ца за адзіна правільны мэтадалёгічны падыход.

Праўда, у апошнія гады Бехцераў спрабаваў перайсьці на пазіцыю дыялектычнага матар'ялізму, аднак, марксызм ён успрыняў чыста павярхоўна, фармальна. Гэта была спроба рэфлексалёгізаваць марксызм. Тое самае ёсьць і ў Сарахціна, ён зьяўляецца самым пасьлядоўным мэханістам. У асноўным Сарахцін прызнаў сваю галоўную мэханістычную памылку ад тым, што ён як і Карнілаў, мэтад дыялектычнага матар'ялізму ставіць побач з мэтадам спалучальных рэфлексаў (для рэфлексалёгаў тыпу Сарахціна мэтад дыялектычнага матар'ялізму зьяўляецца адной з мэтодык рэфлексалёгіі). Але калі мы пагледзім яго працы і яго тэзісы (рэфлекс і псыхалёгія), дык мы бачым, што мэтад дыялектычнага матар'ялізму зьяўляецца фармальна прызнаным і толькі: «маючы на ўвазе агульны дыялектычны мэтад ня варта абмяжоўвацца толькі ім адным, а неабходна карыстацца, апрача гэтага, свае канкрэтным рабочым мэтадам пазнаньня, якім у рэфлексалёгіі зьяўляецца мэтад спалучаных рэфлексаў». Што-ж такое спалучальны рэфлёкс? «Гэта мэтадалёгічны прынцып аб'яднаньня біялёгіі з сацыялёгіяй. Праз спалучальны рэфлекс біялёгічнае становішча сацыяльным» (7-ы тэзіс). Там-жа: «скрываваньне біялёгічнага і сацыяльнага аспэктаў з уласьцівымі мэтадалёгіямі нікольні ня выключае і не ўмаляе спэцыфічнасьці і главенства ў рэфлёксалёгіі мэтаду спалучальных рэфлексаў». Сарахцін увесь час гавора і пад крэсьлівае, што асноўны мэтадалёгічны прынцып і мэтад гэта спалучальны рэфлекс, але зусім ня зразумела, як праз гэты спалучальны рэфлекс атрымліваецца дзеалектычнае пранікаваньне і «біялёгічнае становішча сацыяльным».

Матэрыялістычная дыялектыка толькі яна ёсьць тэорыя пазнаньня, а ня мэтад спалучальных рэфлексаў,—вось на гэта не зьвярнуў увагі праф. Сарахцін.

Тав. Ленін піша: «У любым сказе можна (і павінна), як у ячэйцы», (клетачцы) сэкрыць зачаткі ўсіх элемэнтаў дыялёктыкі, паказаўшы, такім чынам, што ўсяму пазнаньню чалавека агогул уласьціва дыялектыка. А прыродазнаўства паказвае нам... аб'ектыўную прыроду ў тых-жа яе якасьцях, ператварэньне паасобнага ў агульнае, выпадковага ў неабходнае, пераходы, перапляты, узаемную сувязь процілегласьцей» (Ленін, т. XII, стар. 323—325), калі-ж мы бярэм працы Сарахціна, дык бачым, што псыхічныя, сьвядомыя паводзіны чалавека ігнаруюцца Сарахцінам.

Вызначаючы прадмет і мэтад рэфлексалёгіі на 20 стар., там-жа Сарахцін піша, што «найяўнішая небясьпека для рэфлексалёгіі—гэта псыхалёгічная зараза, і адсюль вынік—супярэчнасьці з псыхалёгіяй абвастраць» (1929 г.). Псыхалёгію—за борт; засталіся толькі рэфлексы, з якіх і складаецца ўся дзейнасьць чалавека. Усе паводзіны зводзяцца да фізіялёгічных мэханізмаў. Такім чынам, у чалавека вывучаецца толькі тое, што ўласьціва яму ў яго нізэйшай арганізаванасьці. Ленін-жа яскрава і чотка дае вызначэньне псыхіцы «як вышэйшага прадукту асобным чынам арганізаванай матэрыі». Псыхіка ня можа быць зьведзена да руху матэрыі, яна зьяўляецца адной з уласьцівасьцяй матэрыі, якая рухаецца асобным чынам арганізаванай. З асноўных палажэньняў дыямату яўствуе, што псыхічна існуе, як якасна адрозьненае ад арганічнага.

Адмаўляць якаснасьць псыхічнага, утоеяжсамляць псыхічнае з рухам матэрыі, як гэта робяць некаторыя рэфлексалёгі, г. зн. уступіць на шлях мэханістычнага матар'ялізму, не разумеючы пераходу колькасьці ў якасьць і наадварот, заставацца на ўлоньні фэербахізацтва.

Пераход колькасьці ў якасьць зьяўляецца адным з асноўных законаў дыялектыкі. Толькі на аснове гэтага закону мы можам зразумець якім чым нам узьнікае новае, як у ходзе разьвіцьця паступовая зьмена падрыхтоўвае пераход у новую якасьць. Гэта якаснае новае не зьяўляецца без скачкоў, якія ў сваю чаргу не ўзьнікаюць цудам, ня самі сабою, а ў выніку колькасных зьмен старой якасьці. Бязумоўна, мэтад спалучальных рэфлексаў даў магчымасьць ускрыць генэзіс прасьцейшых працэсаў завязваньня новых сувязяй іх дыфэрэнцыроўкі, іх спалучэньня, але праз яго немагчыма пазнаць утварэньне вышэйшых «поведенческих» сацыяльна абумоўленых мэханізмаў і функцый.

Зводзячы паводзіны чалавека да сумы спалучальных рэфлексаў, Сарахцін ня вывучаў «сьвядомых паводзін». Вось, што ён гаворыць адносна сьвядомасьці: «сьвядомасьць ня існуе як рэальнасьць, гэта паняцьце (прыклад колер)... Сьвядомасьць гэта толькі здольнасьць успрыймаць адчуваньне». (Там-жа 25 стар.) Што-ж такое адчуваньне? Сарахцін адказвае: «адчуваньне-ж зьяўляецца інтраспэктыўным выразам асобнай якасьці тых нэўрафізіялёгічных працэсаў арганізму, якія зьнешне выяўляюцца ў руху. Але паколькі гэта псыхічнае, то яно не ўваходзіць у галіну вывучэньня рэфлексалёгіі; вось да чаго прыходзіць Сарахцін!

«Мысленьне, сьвядомасьць, гаворыць Энгельс у «Антыдзюрынгу», ёсьць прадукты чалавечага мазгу». У «Люд. Фэербаху» чытаем наступнае: «Наша сьвядомасьць і мысьленьне, як бы яны не здаваліся надпачуцьцёвымі, зьяўляюцца прадуктам чалавечага цялеснага органу—мазга. Матэрыя ня ёсьць прадукт духу, а дух ёсьць толькі вышэйшы прадукт матэрыі».

«Сьвядомасьць чалавека - гаворыць Ленін,—прыймаецца за вобраз аб'ектыўнай рэальнасьці». Зьнешні сьвет ёсьць рух гэтай аб'ектыўнай рэальнасьці, які адбываецца нашай сьвядомасьцю. Маркс і Ленін лічаць, што псыхічныя працэсы і сьвядомасьць зьмяняюць паводзіны; Энгельс піша: «нават за ежу і піцьцё чалавек бярэцца пад уплывам адчуваньняў голаду і смагі, якія адрозьніліся ў яго галаве, і перастае піць і есьць таму, што ў яго галаве адбываецца адчуваньне сытасьці». Сам па сабе просты біялёгічны працэс, і то ён апасрэдаваны праз сьвядомасьць і нямысьлімы бяз удзелу сьвядомасьці, а Сарахцін кажа, што неабходна «вывесьць рэфлектарны акт». «Я іду за хлебам у моц таго, што прыйшлі ў рух адпаведныя рухаючыя сэкрэтарныя і інш. саматычныя рэфлексы. Гэтыя рэфлексы пад уплывам зьнешніх сацыяльных раздражальнікаў (стук талерак, гутарка аб ежы) або пад уплывам унутранага раздражальніка (галодны сьстаў крыві), або дзякуючы адначасоваму ўплыву гэтых двух фактараў ажыцьцяўся ў выглядзе складанага спалучальнага комплексу—энграмы майго мінулага спалучальнага вопыту. Ажыцьцяўленьне гэтага складанага рухаючага саматычнага комплексу рэфлексаў пацягнула за сабой інтраспэктыўнае выражэньне—жаданьне ёсьці».

Розьніца паміж тлумачэньнем паводзін у Сарахціна і заснавальнікаў марксызму—калёсальная; гэты апошні пункт гледжаньня нічога агульнага ня мае з марксызмам і ленінізмам.

Як мэханіст, Сарахцін ігнаруе якасны бок, забываючыся, што кожная форма руху ўладае сваёй асобнай закономернасьцю.

Бязумоўна, рэфлексалёгія і рэфлексалёгічная мэтодыка зьяўляюцца капітоўнымі і апошняя павінна выкарыстоўвацца, але павінна заняць сваё абмежаванае месца ў сыстэме навукі пэдалёгіі.

У часопісу «Камуністычнае Выхаваньне» № 9 Сарахцін побач з выпраўленьнем некаторых сваіх памылак застаецца па супрацьлегласьці на тым жа пункце гледжаньня ў вызначэньні навукі аб паводзінах чалавека. Апошнюю ён зводзіць да псыхо-фізіялёгіі, (стар. 83, § 6). Таксама, выпускаючы «Практыкум па рэфлексалёгіі» у 1931 г., у прадмове ён піша: «прадмет рэфлексалёгіі, як самастойная катэдра»... (У нас, бачыце, пры педінстытуце ёсьць пэдалёга-пэдагагічны факультэт, а катэдра пры ім, дзе кіраўніком зьяўляецца Сарахцін, называецца рэфлексалёгіяй). Але разгорнутая крытыка ў РСФСР рэфлёксалёгічнай школы ўказала на тое месца, як

УСКРЫЛІСЯ РЭКІ—

дарога лесасплаву адкрыта

Поўнасьцю вывезьці да сплаўных прыстаней загатоўленую драўніну

Ударнымі тэмпамі працыў у лесе павінен быць ліквідаваны

У першым квартале 4-га заключнага году пяцігодкі Княжыцкі сельсавет павінен быў вывезьці 5180 куба мэтраў лесаматар'ялаў. На 25 сакавіка плян лесавывазак па абодвых сэктарах выкананы ўсяго толькі на 28,5 проц. Гэты ганебны прарыў на леса вывазках—вынік апартуністычнай не даацэнкі значэньня лесавывазкі і поўнай бязьдзейнасьці парт'ячэйкі і сельсавету на гэтым важнейшым вучастку.

Прарыў тлумачыцца і тым, што на лясных дасляках не арганізавана праца на аснове шасьці ўмоў т. Сталіна, не ўкаранены брыгадныя мэтады работы, не ліквідавана ўраўнілаўка. Парт'ячэйка і сельсавет (мусіць лічаць не патрэбным) на працягу ўсяго часу не праводзілі сярод калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў систэматычнай мабілізуючай работы, не вялі рашучай барацьбы з кулацтвам. Замест гэтага сельсавет адыгрываў ролю «грознага адміністратара». «Выехаць заўтра ў лес усёй вёскай»—сыпаліся шматлікія рэзалюцыі. Члены сельсавету на мясцох, у сваю чаргу, спакойна зачытвалі падобныя рэзалюцыі і нічога не рабілі. Кулак і яго агент выкарыстоўвалі бязьдзейнасьць сельсавету, вялі сваю шкодніцкую дзейнасьць. У вёсцы Шчэгліцы кулак Курлянкоў купіў 2-х гадовае жарабя і зараз аслабянецца ад лесавывазак. Яго прыкладу пасьледвалі некаторыя аднаасобнікі.

Складзены пратакол членам сельсавету вёскі Шчэгліцы на цьвёрдазаданьніка, які злосна ўхіляецца ад леса вывазак, яшчэ і на сёньняшні дзень не разгледжаны. Пратакол сходу бедноты (в. Сенькава) аб вывазе члена сельсавету Лук'янава Васіля за бязьдзейнічаньне ў лютым м-цы разгледжаны толькі 12 сакавіка. Адсутнасьць работы з аднаасобнікамі паставіла ў хвост лесавывазку па аднаасобным сэктары. На 20 сакавіка плян па апошнім у 3.200 кубамэтраў выкананы толькі на 859 куб. мэтраў. Асабліва трэба адзначыць злоснае неныкананьне не цьвёрдых заданьняў. На 25 сакавіка плян па цьвёрдым заданьні выкананы толькі на 7,2 проц.

Выязная брыгада газ. «К. М.» разгарнула па-бальшавіцку арганізацыю палітыка-масавай работы сярод калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, дабіліся ўдарных тэмпаў па лесавывазках, згуртаваўшы вакол сябе актыў у 80 чал. Былі прымацаваны брыгады да кожнага калгасу і паселішча для арганізацыі агульна-сельсавецкага чырвонага абозу. Гэта ініцыятыва была шырока падхоплена калгаснікамі, беднякамі і сераднякамі-аднаасобнікамі. Яна была адзна чана чырвоным абозам лесу ў 412 пад вод, які адбыўся 23 сакавіка. Вынікам добра пастаўленай работы можа служыць той факт, што арганізаваныя брыгады па лесавывазках у калгасах працягваюць сваю работу і надалей, рэгулярна выяжджаюць у лес (калгас «1 Мая»). Праведзеная работа ўскалыхнула ўсю грамадзкасьць сельсавету. Так, калі з 15 па 26 сакавіка прырост у выкананьні пляну лесавывазак складаў 0,2 проц., дык з 20 па 25 сакавіка быў прырост на 12—13 проц.

Але замест таго, каб узначаліць ак тыўнасьць мас, накіраваць яе на яшчэ большае разгортваньне ўдарнай работы з тым, каб пасьпяхова завяршыць лесавывазкі, сакратар парт'ячэйкі Бялінскі, будучы пасьлядоўным аматарам самацёку, 5 дзён літаральна пра сядзеў у хаце, старшыня сельсавету Вайценкаў замарынаваўся ў сваім габінэце. Зараз парт'ячэйка і сельсавет, захопленыя посьпехамі чырвонага абозу, адзначываюць зноў да лаўрах бясьпечнасьці.

Нельга абыйсьці моўчкі і такі агідны факт, калі леспрамгас замест непасрэднай работы—арганізацыі лесавывазак, займаецца перахопліваньнем. У той час, калі лесапільныя заводы адчуваюць патрэбу ў лесаматар'ялах, леспрамгас перахапіў чырвоны абоз в лесам і накіраваў яго для скарыстаньня на мясцовыя патрэбы—шоклы, масты і г. д., на патрэбы якіх можна было лес вывезьці ў той час, калі дарога крыху сапсавалася-б. Па добнымі адносінамі леспрамгасу павінны заняцца адпаведныя арганізацыі.

Парт'ячэйка і сельсавет павінны пакончыць з работай «па-старыцы». Больш увагі лесавывазкам і лесасплаву. Пагалоўнай мабілізацыяй усіх сіл, узмацненьнем наступальнай палітыкі на кулака (праверка выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі), разгортваньнем сацыялістычных форм працы, Княжыцкі сельсавет павінен забясьпечыць 100-процантнае выкананьне пляну лесавывазкі і сплаву.

Брыгада: «Сав. Бел.» Д. Алан, Я. Глушынскі, С. Скапец, Сьцепан'ян, Віньнікаў і Сільвестраў.

Аршанскі леспрамгас выканаў плян леса загатовак і вывазкі

У першым квартале гэтага году Аршанскі леспрамгас павінен быў загатовіць булаўнічай драўніны 49.504 к-м, дроў—30.000 к-м, вывезьці будаўнічай драўніны—70.000 к-м, дроў—30.000.

Дзякуючы ўдарнай рабоце саміх работнікаў леспрамгасу, актыўнаму ўдзелу ў загатоўках і вывазцы лесу калгасаў і бяднякоў-серадняцкіх мас і аднаасобнікаў раёну, пры дапамозе раённых і вясковых арганізацый—квартальны плян леспрамгасам выкананы да тэрміну—29 сакавіка. Заданьне па загатоўцы булаўнічай драўніны выкананa на 133 проц., па загатоўцы дроў—на 103 проц. Плян лесавывазкі выкананы па будаўнічай драўніне на 101 проц., па дровах—на 105 проц.

Гадавая лесаэксплятацыйная праграма леспрамгасам выкананa ў першым квартале па піловачным—на 153 пр., па шпалях—на 101 проц., па балянсе—на 50 проц., па эпілетных бальках—на 80 проц., па пропсах—на 100 проц.

Пераключаючыся на выкананьне праграмы другога кварталу і дагляду за лесам і вычыстцы яго, работнікі леспрамгасу выклікалі на сацпаборніцтва Дубровенскі леспрамгас па лепшым выкананьні і перавыкананьні пляну другога кварталу гэтага году.

А. Оршын.

Вендарск сельсавет зрывае лесавывазкі

Лесавывазка па Вендарскім сельсавеце, Магілёўскага раёну, да сучаснага моманту пастаўлена вельмі дрэнна. Сельсавет па-апартуністычнаму адносіцца да гэтай важнейшай справы, лічачы, што час лесавывазкі ўжо прайшоў, надыйшла вясна і трэба заняцца сяўбой. У выніку гэтага пасобныя калгасы праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у справе лесавывазкі.

Калгас «Варашылаў», які налічвае вялікую цягавую сілу, толькі вывез усяго 120 км драўніны, замест 450 км паводле пляну.

Лепш абстаіць справа з лесавывазкай у Хрынялеўскім сельсавеце. У выніку мабілізацыі ўвагі калгаснікаў на пасьпяховае выкананьне лесавывазкі, шляхам арганізацыі сталых брыгад возчыкаў і арганізацыі чырвонага абозу, калгас «Энэргія» выканаў заданьне па вывазцы драўніны на 120 проц.

Прыкладу калгасу «Энэргія» павінны пасьледваць і астатнія, калгасы.

Цімох Лявіцкі.

Гонар ударнікаў фінфронту—

выкананьне 50 проц. пляну 2-га кварталу да 1 мая

Выканаць абавязацельства

ЦК КП(б)Б, Наркамфіну, ЦП саюзу ФБР

Чацьверты раённы зьлёт ударнікаў фінансавага фронту Сіроцінішчыны, які адбыўся 6 красавіка, абавязуецца выканаць 50 проц. квартальнага пляну да 1 мая і 100 проц.—да 15 чэрвеня. Выклікаем на сацспаборніцтва фінударнікаў Гарадоцкага раёну.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЛЕТУ.

Выкананьне фінпляну II кварталу да 10 чэрвеня—баявая задача пралетарскай грамадзкасьці

Пастанова Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР

Аб вынніках мабілізацыі сродкаў на сельніцтва за першы квартал

1. Дзякуючы шырока разгорнутай масавай работы і актыўнага ўдзелу пралетарскай грамадзкасьці, рабочых і калгасных мас сялянства, вялізарнай шай ролі цэнтральнага і мясцовага друку, Беларускай ССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва выкананы на 103,2 проц.

2. Народны Камісарыят Фінансаў БССР з асаблівым задавальненьнем адзначае вялізарнейшую, бальшавіцкіх тэмпаў работу партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый і органаў фінансава-кредытнай сыстэмы, асноўных пралетарскіх цэнтраў гарадоў: Менску, Гомелю, Віцебску, а таксама раёнаў: Тураўскага, Магілёўскага, Сіроцінскага, Заслаўскага, Рэчыцкага, Мазырскага, Мсьціслаўскага, Чырвона-Слабодзкага, Церахаўскага, Быхаўскага, Жытковіцкага, Бабруйскага, Лёзьненскага і Дубровенскага. Гэтыя перадавыя гарады і раёны датэрмінова перавыканалі квартальны плян мабілізацыі сродкаў на сельніцтва.

3. Даручыць камісіі па прам'язьлені пры Народным Камісарыяце Фінансаў у дакладны тэрмін разгледзіць і вырашыць пытаньне прам'яваныя перадавых гарадоў, раёнаў, саветаў, сэкцый саветаў, заводаў, саўгасаў, калгасаў, камсодаў, грамадзкіх арганізацый і пасобных ударнікаў і ўдарніц фінансавага фронту, вызначаючы адпаведныя преміі за выдатную работу па мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў першым квартале.

4. Прасіць партыйна-савецкае кіраўніцтва і грамадзкія арганізацыі ад сталых раёнаў: Полацкага, Горацкага, Нараўлянскага, Брагінскага, Шклоўскага, Капыльскага, Петрыкаўскага, Кармянскага, Ельскага, Жлобінскага, Чачэрскага, Вушацкага, Крычаўскага, Бялынвіцкага, Гарадоцкага, Уваравіцкага, Веткаўскага, Бярэзінскага, Клімавіцкага, Лельчыцкага, Бягомльскага, Расонскага, Асьвейскага, Бешанковіцкага і Стара-Дароскага вынішць і ліквідаваць усе прычыны апартуністычнага самацёку і адставаньня ў справе мабілізацыі сродкаў у гэтых раёнах; узмацніць фінансава-кредытны апарат, узмацніць непасрэднае штодзённае кіраўніцтва справай мабілізацыі сродкаў і вывесьці свае адстаючыя раёны ў рады перадавых—на працягу II кварталу.

Фінансавыя органы перадавых раёнаў павінны ўзяць на грамадзкі буксір адстаючых суседзяў (раёны) і дапамагчы ім выйсьці з паласы прарываў.

5. Народны Камісарыят Фінансаў БССР абавязвае Гарфа, Райфа, усю фінансава-кредытна-банкаўскую сыстэму БССР, фінансавыя сэкцыі саветаў, пасьнікаў старшынь сельсветаў (фінансавыя работнікі) і заклікае ўдарнікаў і ўдарніц фінансавага фронту, камсоды, прафсаюзныя, камсамольскія, піянэрскія і ўсе іншыя грамадзкія арганізацыі замацаваць дасягнутыя посьпехі і зараз-жа пабальшавіцку разгарнуць масавую работу па мабілізацыі сродкаў, шляхам нарад, зьлётаў, сацспаборніцтва, ударніцтва, арганізацыі брыгад і гатыя забясьпечыць на кожным вучастку поўнае і датэрміновае (да 10-15 чэрвеня) выкананьне фінансавага пляну другога кварталу.

6. Сканцэнтраваць асноўную увагу ўгаліне мабілізацыі сродкаў насельніцтва на ліквідацыю ўсёй запазычанасьці па абавязковых плацяжох, а таксама на адстаючым вучастку фінансавай работы па дабраахвотных плацяжох на арганізацыю збораў сродкаў па пазыцы, па апчадсправе, па пазыках накапленьняў калгасаў, па распаўсюджваньні акцый Трактарацэнтру.

Галоўнай і асноўнай баявой задачай на фінансавым фронце застаецца і надалей—дабіваца спражэйшай экономіі грашовых сродкаў ва ўсёй дзейнасьці выкананьня народна-гаспадарчых пляноў заключнага году пяцігодкі—«мабілізаваць максымум сродкаў на справу фінансаваньня нашай індустрыі, нашых саўгасаў і калгасаў».

Народны Камісар Фінансаў БССР
А. Хацкевіч.

5 красавіка 1932 г.
г. Менск.



т. ХАЦКЕВІЧ сярод дэлегатак-зьлёту ўдарніц фінфронту, перадавых раёнаў.

Фінработа—адсталы вучастак прафсаюзаў

Тав. РЫЖОЎ (старшыня ЦС СБ)

Таварышы, дазвольце ад імя Цэнтральнага савету прафсаюзаў БССР перадаць зьлёту ўдарніц бальшавіцкае прывітаньне.

Таварышы, на вашых вачох адбываецца будаўніцтва сацыялізму. Вы самі бачыце як з кожным годам, з кожным днём, з кожнай гадзінай узрастае колькасьць сацыялістычных прадпрыемстваў.

БССР з краіны адсталай, дробна-раздробленай сельскай гаспадаркі, не ратварылася ў краіну буйнага росту прамысловасьці, саўгасаў і калгасаў.

Мы ўжо маем звыш 100 тыс. рабочых на нашых прадпрыемствах, у той час, калі некалькі год назад мы налічвалі толькі некалькі дзесяткаў тысяч рабочых, якія працавалі ў паўсаматужных майстэрнях.

Мы на сёньняшні дзень маем звыш 50 проц. калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Таварышы, наша сацыялістычная будоўля, будаўніцтва фабрык і заводаў, будаўніцтва саўгасаў і калгасаў патрабуюць ад нас фінансавых затрат. Таму, фінансавы фронт набыў і набывае досыць значнае месца ва ўсёй нашай рабоце.

Мы на гэтым фронце бязумоўна маем вялікія дасягненьні, асабліва на некаторых раёнах.

Возьмем Гомель. Гомель—у першым квартале ідзе ўперадзе многіх раёнаў, выконваючы прамфінплян на ўсе 100 проц.

У гарадох у нас мабілізацыя сродкаў ідзе лепш, чым на вёсцы. На вёсцы гэта справа пастаўлена дрэнна. Таварышы калгасьніцы-ўдарніцы! На гэтую справу трэба зьвярнуць увагу. Нам патрэбны машыны, трактары, прычэпныя машыны, бульбакапалкі, сеялкі, веялкі, малатарні—зусім правільна, што гэтыя машыны патрэбны, але для гэтага трэба выконваць і фінплян. Трэба, як мага, узмацніць работу ў гэтым напрамку з тым, каб ніводнай капейкі ў кулака не засталося. Нам зараз грошы патрэбны і нам кожная капейка дорага, мы павінны сачыць за тым, каб яна не засталася ў кулака, а ішла на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва.

Выканаць фінплян мы зможам толькі тады, калі будзем працаваць па-новаму. Ці цмат ужывалі мы формы буксірных брыгад у фінансавай рабоце. Мы ўжывалі ,але яшчэ недастткова, а гэтыя брыгады даюць нам добрыя вынікі. Швэйная фабрыка ў Магілёве ня выканала свой прамфінплян—выпусьціла толькі 50 проц. прадукцыі. Была паслана буксірная брыгада з менскіх прадпрыемстваў і гэта фабрыка выканала замест 50 проц.—120.

Трэба на добрых прыкладах вучыць ца як трэба працаваць, а дрэнныя прыклады трэба з усёй пралетарскай самакрытыкай ускрываць. Тады ў нас наньня нашых плянавых заданьняў.

У нас існуюць камсоды. А як ім дапамагаюць у выкананьні нашых заданьняў, як яны працуюць, ніхто ня ведае. Іх забылі як прафэсыянальныя арганізацыі, так і органы НКФіну на мясцох.

Таварышы, я лічу, што з боку прафсаюзаў ня ўсё зроблена на фронце мабілізацыі сродкаў. Я лічу, што нашы ўдарніцы павінны сказаць па гэтым пытаньні рашаючае слова.

Калі мы ўступаем у другі квартал барацьбы за фінплян, мы павінны паставіць перад сабой задачу, што мы прарываў ня будзем цярпець і прарываў у нас ня будзе. Прарывы, якія ёсьць у некаторых раёнах, павінны быць ліквідаваны ў другім квартале. Гэта дасьць магчымасьць яшчэ шырэй разгарнуць у БССР сацыялістычнае будаўніцтва фабрык і заводаў, калгасаў, саўгасаў, сацыяльна-культурных і бытавых устаноў.

Калі мы мабілізуем усіх членаў прафсаюзаў на фінфронт, тады адстаючых раёнаў у нас ня будзе, яны падцягнуцца.

Зьлёт ударніц павінен разгарнуць ініцыятыву кожнага працоўнага ў напрамку фінансавай работы. Гэтай ініцыятывай трэба правільна кіраваць і тады будзе забясьпечана выкананьне фінансавага пляну бальшавіцкімі тэмпамі, тады мы здолеем рапартаваць перад нашай партыяй, што мы здольны кіраваць пралетарскай дзяржавай.

*) Падаецца ў скарочаным выглядзе.

Да ўсесаюзнай канфэрэнцыі па разьмяшчэньню вытворчых сіл

Да ўсіх навуковых устаноў, якія ўдзельнічаюць у нарадзе БАН па разьмяркаваньню вытворчых сіл

15-га красавіка ў Маскве склікаецца 1-я Усесаюзная канфэрэнцыя па разьмяшчэньні вытворчых сіл Савецкага Саюзу. Яна зьяўляецца як-бы уводзінамі да той вялізарнай работы, якая разгортваецца па выпрацоўцы другой пяцігодкі. Канфэрэнцыя можа справіцца са сваёй задачай, калі нашы навуковыя ўстановы ў тым ліку і БССР прымуць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы канфэрэнцыі і прадставяць ёй апошнія дасягненьні нашых навукова-дасьледчых інстытутаў.

Вядома, якое вялізарнейшае значэньне прыдавай Ленін ролі навукі яшчэ пры выпрацоўцы гаспадарчага пляну ў 1921 годзе. «Навуковая выпрацоўка даяржаўнага пляну ўсёй нашай гаспадаркі—пісаў ён, ці мож на не зразумець гэтых слоў, гэтага ранізьня нашай вышэйшай улады». У сучасны момант роля навукі яшчэ больш узрасла. Аб гэтым неаднаразова падкрэсьліваў тав. Сталін. Яшчэ на XVI партыйнай канфэрэнцыі тав. Сталін з усёй рашучасьцю заявіў, што «перш-за-ўсё праблема правільнага разьмяшчэньня прамысловасьці на СССР; як-бы мы не разгортвалі народную гаспадарку, нельга абыйсьціся без пытаньня аб тым, як правільна разьмясьціць гаспадарку».

Сацыялістычнае разьмяшчэньне вытворчых сіл заключаецца ў тым, што яно грунтуюцца на навуковай базе, якая дазваляе ўстанавіць свайго роду алгэбры канвэер, пачынаючы з геолёгічнага вывучэньня зямлі і канчаючы рацыянальным выкарыстоўваньнем на ных зямных багацьцяў і сыравінных расурсаў. Гэтыя задачы, якія стаяць перад канфэрэнцыяй, паўтараем, могуць быць выкананы пры умове выкарыстаньня апошніх даных навукі і тэхнікі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

У мэтах падрыхтоўкі да Ўсесаюзнай канфэрэнцыі, Беларуская Акадэмія Навук склікае 8 красавіка нараду навуковых устаноў. На ёй павінны быць падагулены апошнія дасягненьні нашай навуковай работы, на аснове якіх будзе абгаварвацца пытаньне аб профілю БССР у сыстэме гаспадаркі СССР. Гэта нарада, апроч таго, зьяўляецца падрыхтоўчым крокам да канфэрэнцыі навуковых устаноў БССР, якая склікаецца Беларускай Акадэміяй Навук у сярэдзіне мая для абгаварэньня пытаньняў аб другой пяцігодцы БССР і выпрацоўкі пляну другой пяцігодкі навукова-дасьледчай работы.

Акадэмія навук ўпэўнена, што навуковыя ўстановы прымуць самы актыўны ўдзел у гэтай нарадзе, якая зьяўляецца аглядам, як наша навукова-дасьледчая работа падрыхтавалася да сучаснасьці. На ёй мы павінны выявіць нашы слабыя месцы і забясьпечыць, каб навука сапраўды была арганічна зьвязана з сацыялістычным будаўніцтвам, каб дакладна ўстанавіць тыя заданьні, якія стаяць перад кожным інстытутам у сувязі з распрацоўкай другой пяцігодкі.

ПРЭЗЫДЭНТ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК П. ГОРЫН.

Макет штодзёнкі „За савецкі гандаль" неадкладна распаўсюдзіць

Для лепшай арганізацыі і большага распаўсюджваньня нізавых штодзённых газэт, рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» па прапанове ЦК КП(б)Б быў выпушчаны ў 1931 годзе макет насьценнай штодзёнкі «За савецкі гандаль».

Гэты макет быў надрукаваны ў 10.000 экз. і разасланы Наркамснабу, Белкаапсаюзу і Белгандлю для разьмяркаваньня на крамах і складах.

Прайшоў ужо доўгі час са дня выпуску макету і ў парадку праверкі выкананьня рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» разам з ЦП саюзу саўгандлькслужачых арганізавалі рэйд на праверцы скарыстаньня жакетаў «За савецкі гандаль».

Рэйд брыгад выявіў бюракратычныя адносіны да распаўсюджваньня макетаў штодзённак. Так у Наркамснабе гэтыя макеты пралежалі амаль месяц, пакуль яны былі разасланы на месцы. У Белкаапсаюзе наокул ня ведаюць, што гэта за макеты і для чаго яны патрэбны.

У краме Белгандлю № 11 макеты ляжаць на складзе, у той час, як насьценгазэта за 6 месяцаў была выпушчана толькі адзін раз. Такое-ж стаіць вінча і ў краме Белгандлю № 2. Насьценная газэта ў краме зусім ня выходзіць, а макеты ляжаць і адначываюць, чакаючы «лепшага надвор'я». На запытаньне брыгады, чаму-ж ня выходзіць насьценгазэта, загадчык крамы спакойна адказвае: «гэта справа не мая, а мясцкому і няхай ён што хоча, тое і робіць».

Культработнік Белгандлю нават ня ведае пра існаваньне макетаў «За савецкі гандаль», бо, бачыце, калі прыбылі макеты, ён быў у «камандыроўцы».

Гэтыя факты гавораць аб тым, што Наркаснаб, Белкаапсаюз і «Белгандаль» бюракратычна адносяцца да рассылкі макетаў «За савецкі гандаль, правялі праваапартуністычную недаацэнку нізавога друку, як магутнай зброі ў руках партыі і рабочай класы.

Мы патрабуем ад гэтых устаноў прыняцьця тэрміновых мер да таго, каб макет «За савецкі гандаль» быў на тым месцы, якое яму прызначана. Грошы, якія затрачаны на выпуск макетаў, не павінны быць кінуты на вецер.

Макет павінен быць скарыстаны ў кожнай краме, у кожным магазыне на выпуск штодзённай насьценгазэты. Гэтыя штодзённы павінны адбіць работу савецкай кампэрацыі.

Артыкул напісаны паводле матар'ялаў рэйду брыгад, у якіх удзельнічалі т. т. Ліўшыц, Цэйтліна, Сьвірноўская, Урбановіч, Зайдаль, Славінаўскі, Каган, Жараў, Глазенбэрг, Зірбэрглейт, Рубенчык, Тафэйн, Цалкус, Рубенчык і Левін.

Аб грашовай даплаце сьвінаром

за вырошчваньне парасят і здачу таварнай прадукцыі

ПАСТАНОВА ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР

Для стымуляваньня работы сьвінароў, якія працуюць на СТКФ па вырошчваньні маладняка і выхаваньні яго, для павышэньня таварнасьці і большай зацікаўленасьці сьвінароў у выкананьні пляну здачы таварнай прадукцыі, прапанаваць Калгасаюзам і калгасам, загадчыкам кантор і ўпаў наважным Сьвінаводкалгасаюзу ўвесьці з 1 красавіка грашовую даплату сьвінаром звыш налічэньня працадзён па 1 руб. за кожны цэнтнэр зданай таварнай прадукцыі.

Сьвінаводкалгасаюзу і праўленьням калгасаюзаў шырока папулярызаваць гэту пастанову сярод калгаснікаў, дэтальна прапрацаваўшы гэтыя мерапрыемствы на вытворчых нарадах СТКФ і забясьпечыць спачасовую выплату вызначаных прэмій.

Старшыня Калгасцэнтру БССР—
С. МІЦЬКОЎ.

В. Ажгірэй

Цёплы ўспамін на адлежаным фрэнчы або „Паэзія чырвонаармейца" Р. Казака

Зборнік вершаў. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, 1931 г. стар. 55. Цана 50 кап.

У прадмове да свайго зборніку Р. Казак атэстуе яго так:

«Стрэл вайсковай тэматыкі павінен быць гучным і небескарысным... Гэты зборнік вершаў—голас байца, які заклікае чырвонаармейцаў-ударнікаў па ўсіх франтох змагацца і ў словах класьці моц—піраксілін... Жыцьцё казармы, баявая падрыхтоўка, палітычная вучоба ў радох Чырвонай армії павінна быць паказана яскрава, поўна, сакавіта»...

Што-ж мы знаходзім у яго вершах на справе. Палітычная вучоба ў зборніку нават не закранута, жыцьцё казармы таксама адсутнічае. Дарэмна шукаць у зборніку вобразаў лепшых ударнікаў, валявых камандзіраў; не паказана і чырвонаармейская маса. Вучоба і сацспаборніцтва ў Чырвонай армії закрануты толькі ў двух вершах: «У манежы» і «Снайпэрская песьня».

Каб мець паняцьце аб тым, як творыць Р. Казак, разгледзім яго верш «У тэмпах дзён». Пачынаецца верш так:

У песьнях юнацтва ня будзе забы тым
Чую—
і сьмеласьць і сьмех і задор.
Нібы на порхаўку ботам,—
Над бытам
Трызны старой
Вынашу прыгавор:
— Сьмерць, спапяленьне!

Прачытаеш вось такое—і рукамі разведзеш: гучна, але ня граматна, безалкова, сэнсу—ні на грош. Чытаем далей:

Я чую і бачу
Грукат, дынаміку, скоку і рухі;
Крыкі жалеза, бэтону...
Грукат тачак
І неспакойнасьць (?!) мазолістых рук.

Глядзіцё вы павярхоўна, тав. Казак, а таму і бачыце толькі знадворны бок справы. Гэта-ж самае «бачыць і чуе» і любы мешчанін, а ад пісьменніка мы мусім патрабаваць большага. Напрыклад, у рабочага вы заўважылі толькі мазолістыя рукі; а як у яго наконт адносін да работы, зжываньня старых прывычак і г. д.? Як па вашаму: ён-жа не дадатак да машыны, а жывы чалавек.

Сказаўшы далей у трох радкох пра тэмпы і паклёўшы розным тэм «мілёрдам», аўтар «не на жарт» прыгразіў апошным:

Словы гранітамі цяжкімі кіну—
Вежы разбураць царквей і цямніц.

Пасьля гэтых «гранітных» слоў, якія яшчэ будуць кінуты, аўтар зноў варочаецца да будаўніцтва, якое на гэты раз выклікае ў яго песенны боль (што гэта яшчэ за новая хвароба такая?):

Бачу разгон гэтых дзён будаўніцтва,
Ці-ж не з таго нейкі песенны боль?
У сэрцы ніводзін палёстак ня выцьвіў,
Краіна, да мозгу пранятая табой.

(Чым гэта краіна пранята: песенняй гэтай самай болью?) І далей:

Сёньня я гейзер высокіх пачуцьцяў
І з песьняй простай, як просты і сам,
Хачу, каб навокал мой голас быў чуцен,
І рапарт краіне аб тэмпах пісаць.

Вось у тым-та аказваецца, і бяда ўся, што пісьменьнік зьяўляецца «гейзерам пачуцьцяў», гейзерам, выліваючым бурапенную, цёпленькую вадзічку. Гэта вадзічка б'е з такой сілай, што поэта ня можа накіраваць яе ў пэўнае рэчышча; вось чаму ён, пачаўшы гаварыць аб рапарце краіне, тут-жа забываецца пра яго і ні з таго ні з сяго заліваe:

Як дзіўна:
Здаецца, быў вучнем нядаўна,
Званок... І на лекцыю з кніжкай бягу.
Учора—ля дошкі бязвусы настаўнік,
Сягоньня-ж сустрэў я казарменны гул.

(Што-ж тут характарнага для тэмпаў нашых дзён?).

І ў доўгай шынэлі задорна вясёлы,
Збоку клінок, на гарачым кані
Полем імчуся ў рабочы пасёлак.
Ноч мне прыносіць заводаў агні.
Пальцы спакойна ляжаць на эфесе
Гэтак, часамі, і ноч і дазор (?!)
Варта, сачы!
Дні будоўлі і песень

Вораг спрабуе схапіць на лязо.
Чаго пісьменьнік ехаў у рабочы пасёлак? Адкуль узялася варта? (Ці ня пад вартай ехаў?). Што рабіў у рабочым пасёлку, і ці даехаў наогул,—усё «сне покрыто мраком неизвестности». У наступных радкох аўтар і пра ворага і пра завод забываецца і перад намі ўжо вядомая кіно-хроніка:

Кіноістужкай праходзіць нядаўняе...
Рой успамінаў прыгожа квяціст:
Некалі—вучань
Учора—настаўнік.
Сёньня—узброены кавалерыст.

Але кіноістужка раптам ірвецца,—аўтар закацёў на цэлы радок шматкроп'е. Стаўлю шматкроп'е і я...

Дзякуючы таму, што тав. Казак лёгка адносіцца да матар'ялу, не прадумляе, ня ўзважвае яго, у вершах часам трапляюцца проста-такі кур'ёзныя рэчы. Вось ён гаворыць пра будучую вайну:

З быстрым наскокам
Ліхі эскадрон будзе прыносіць
Ахвяр на вячару.
Жорстка і жудасна ўчынецца баль...
Мяса кавалкамі
Сінія трупы.

На вячэру—мяса з сініх трупаў... Гэта такое меню, што пальчыкі аблізваш!

Кур'ёзныя вобразы і проста няграматна пабудаваныя, блытаныя фразы сустракаем на кожным кроку:

Конь,
Калі ў прыгаршчы (?!) мускулы гроб,

Значыць—асіліць і ямы і горы.

У вершы «Чырвонаармейцаў ліхі эскадрон» (стар. 29) знаходзім наступныя радкі:

Вінтоўка, клінок
І навостраны штых
Глядзяць асьцярожна
У стагодзьдзі,
Праз кроў і ахвяры
Мы дзён залатых
Вялікае сонца ўчародзім
Імчыцца галёпам
Ліхі эскадрон,
На сэрцы ў кожнага вера,
Што шлемы амыюцца
Раньняй зарой
І шчасьце дагонім кар'ерам.

Вось і растлумачце нам, тав. Казак, чаму гэта зброя (ды яшчэ асьцярожна, з апаскаю) глядзіць у стагодзьдзі? Ці ня значыць гэта, што цэлыя стагодзьдзі яшчэ мы будзем узброенымі, інакш кажучы—будзем у капіталістычным абкружэньні? Вы-ж добра ведаеце, што сусьветная буржуазія шалёна рыхтуецца да нападу на СССР, бо толькі ў вайне з намі яна бачыць выхад з крызісу. Аб якіх-жа стагодзьдзях можа быць гутарка? Гэта пустазвонасьць аб узраньні ў стагодзьдзі зусім ня здольная мабілізаваць нашу пільнасьць і нашу гатоўнасьць да апошняга рашаючага бою з сусьветным капіталам, а яераз наадва рот: яна сырыя ўсыпленьню гэтай пільнасьці і гатоўнасьці.

Паківаўшы асьцярожненька зброяй у стагодзьдзі, Р. Казак ні з сяго ні з таго пачынае гаварыць пра кроў і ахвяры:

Праз кроў і ахвяры
Мы дзён залатых
Вялікае сонца ўзродзім.

Якое-ж гэта сонца зьбіраецца «узраджаць» аўтар вершу? Наконт усякіх гэтых сонц трэба выражацца наогул ясьней і потым: «узраджіць», (па расійску «возродить» ,а па беларуску «адраджіць») можна толькі тое, што ўжо было, але зьнікла, а аўтар, як відаць, зьбіраецца ўзраджіць тое, чаго яшчэ ня было.

Нарэшце,—апошняя фраза (ад слоў «Імчыцца галёпам» і канчаючы словамі—«І шчасьце дагонім кар'ерам»). Аллах яго ведае, што тут аўтар разумее пад раньняй зарой, якой «яшчэ амыюцца шлемы». Таксама зусім незразумела за якім гэта шчасьцем так. Казак ганяецца кар'ерам. Адно толькі ясна, што даганяць можна толькі тое, што ўцякае, а раз шчасьце ўцякае, то, відаць, яно настроена ня дужа прыязна да вас, тав. Казак!

Яшчэ адна характарная рыса ў пісьменьніка: ён толькі ўсё абяцае; «пайду», «змагу», «зраблю», і абмінае такія дзеясловы, як «іду», «раблю», «змагаюся».

З пяром, з вінтоўкаю змагацца
За лепшы сьвет пайсьці магу,
«Магу»—гэта яшчэ ня значыць, што «пайду». Замест дзеяньня, у яго толькі парываньні:

Я сэрцам чэрпаў усё, што мог.
Я парываўся сьцяг прынесьці

Карысьней чэрпаць розумам, узброеным марксысцкім сьветапоглядам, а ня сэрцам, тав. Казак!

У вершах «Песьня аб рэчах» і «Помню калісьці сказаў палітрук», напісаных, да рэчы,—на адзін капыл, мы бачым аўтара дэмабілізаваным з арміі. Чым-жа ён займаецца? Ён ударнік на заводзе, у калгасе? Дае малюнкі працы і жыцьця рабочых і калгаснікаў? —Памыляецеся.—Ён піша аб тым, як, расчыніўшы чамадан, перабірае:

Рэчы—
Патроны і ад шашкі цямляк,
Ржавыя шпоры, мутэрка і трэнчык.

Перабіраючы рэчы, успамінае мінулыя дні ў арміі і думае аб будучай вайне. І тут-жа, як быццам апамятаўшыся, што неяк-жа трэба рэагаваць і на навакольнае жыцьцё, ён штосьці пачынае мармытаць і пра ўдарніцтва і спаборніцтва, і вельмі туманна:

Дні сацспаборніцтва
У кроках байца,
Кожнае слова ў жыцьці пераплавіў (?)
Той ня ўдарнік,
Хто мог (!) абяцаць
Сам не зрабіўшы нічога на справе.

Ясна, што чытач апошнія словы пры ведзенага ўрыўку заадрасоўвае самому аўтару, бо ўспаміны і мары, выкліканыя старымі шпорамі і гімнасьцёркай—гэта яшчэ не змаганьне за тэмпы будаўніцтва. Ад гэтых успамінаў павявае інтэлігенцкай расчуласьцю:

І заньвітаў,
Як вясною зямля
Цёплы ўспамін
на адлежаным фрэнчы. (!)

З 17 вершаў, зьмешчаных у зборніку, можна выбраць толькі штук шэсьць, вартых увагі чытача, гэта: «Снайпэрская песьня», «У манежы», (праўда, гэты верш з траскучым канцом: «Чуе конь—нам жыцьцё—барацьба»... Які, падумаеш, палітычна-разьвіты конь!), далей ідуць: «Вязоўна годны», «Хто румзае», «Ганебна», «За газэтай». Гэтыя творы сьведчаць аб тым, што паэта можа даваць сацыяльна значымыя, напісаныя з ўздымам, з пачуцьцём вершы. Але аўтар на на вучыўся яшчэ абмяжоўваць сябе, і яго пачуцьцё ў некаторых вершах расплываецца, а язык тады гаворыць шмат непатрэбнага, непрадуманага, а таму—і нявернага. Адсюль-жа і туманнасьць, і, часам, слоўная бразгатня, (гл. вершы «У тэмпах дзён», «Мая лірыка», «Чырвонаармейцаў ліхі эскадрон», «Песьня аб рэчах»), гэта «растекание мыслию по древу» сьведчыць і аб адсутнасьці яшчэ чоткага сьветапогляду ў тав. Казака. Многія вершы г

Пра рэарганізацыю Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК СССР за 5 студзеня 1932 г. «Пра ўтварэньне Народных Камісарыятаў Цяжкай, Лёгкай і Лясной Прамысловасьці» (З. З. СССР 1932 г., № 1, арт. 4), пастановаю СНК СССР за 10 студзеня 1932 г. «Пра перадачу аб'яднаньняў і прадпрыемстваў, якія знаходзіліся пад ведамам ВСНГ СССР, Народным Камісарыятам Лёгкай і Лясной Прамысловасьці» (З. З. СССР 1932 г., № 4, арт. 24) і пастановаю ЦВК і СНК СССР за 27 сакавіка 1932 г. «Пра арганізацыю кіраваньня рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьцю ў сувязі з рэарганізацыяй ВСНГ СССР» (газ. «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» № 88 за 29-III—1932 г.), ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Рэарганізаваць Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі БССР у Народны Камісарыят Лёгкай Прамысловасьці БССР.

2. Пад ведамам Народнага Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці БССР знаходзяцца наступныя рэспубліканскія гаспадарчыя арганізацыі з прадпрыемствамі, якія ўваходзяць у іх склад:

а) Белтэкстыльаб'яднаньне,
б) Белскураб'яднаньне,
в) Белшвэйаб'яднаньне,
г) Белшклоаб'яднаньне, уключаючы і Гомельскую мэханізаваную гуту,
д) Белзапалкаб'яднаньне, уключаючы фанэрныя цэхы запалкавых фабрык,
е) Белпаліграфаб'яднаньне,
ж) Белхімаб'яднаньне ў складзе прадпрыемстваў: «Чырвоны Хімік»—Гомель, лака-палітурны завод—Рэчыца, завод фарбаў—Лоёў, косьцяапрацовачны завод—Магілёў, крэйдавы завод—Крычаў, галянтарэйная фабрыка «Беларуская»—Менск,
з) Белбудаб'яднаньне,
і) Белцыль,
к) Тэхнічнае выдавецтва.

3. Пад беспасрэдным ведамам Народнага Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці БССР знаходзяцца наступныя навукова-дасьледчыя інстытуты і навучальныя ўстановы:

а) Курсы Чырвоных дырэктароў — Менск,
б) Будаўнічы Інстытут — Менск.,
в) Архітэктурна — Будаўнічы Тэхнікум—Менск,
г) Хімічна - Тэхналёгічны Тэхнікум Менск,
д) Будаўнічы Тэхнікум—Магілеў,
е) Тэкстыльны Тэхнікум—Віцебск,
ж) Швэйны Тэхнікум—Віцебск,
з) Запалкавы Тэхнікум—Н.-Барысаў,
і) Вячэрні Швэйны Тэхнікум—Віцебск
к) Вячэрні Рабочы Тэхнікум — Менск,
л) Вячэрні Будаўнічы Тэхнікум—Магілёў,
м) Вячэрні Запалкавы Тэхнікум—Н.-Барысаў,
н) Вячэрні Тэкстыльны Тэхнікум—Віцебск.
о) Рабфак пры Будаўнічым Інстытуце—Менск,
п) Рабфак пры Хімічна-Тэхналёгічным Інстытуце—Менск,
р) Вячэрні Рабфак пры Будаўнічым Інстытуце—Менск,
с) Вячэрні Рабфак пры Хімічна-тэхналёгічным Інстытуце—Менск,
т) Вячэрні Рабфак пры Будаўнічым Інстытуце—Жлобін.

Навукова-Дасьледчы Інстытут Прамысловасьці і Хімічна-Тэхналёгічны Інстытут часова знаходзяцца пад беспасрэдным ведамам Народнага Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці БССР.

4. Для абслугоўваньня лёгкай прамысловасьці БССР пад ведамам Народнага Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці БССР знаходзяцца:

а) торфавы завод «Зьвязда», якія ўключаюцца ў склад Белшклоаб'яднаньня;
б) торфавы завод «Чырвоны Кастрычнік», які ўключаецца ў склад Белшклоаб'яднаньня;
в) торфавы завод «Ленінскі Шлях», які ўключаецца ў склад Белшклоаб'яднаньня;
г) торфавы завод «Чырвоны Тарфянік», які ўключаецца ў склад Белтэкстыльаб'яднаньня;
д) торфавы завод «Камунар», які ўключаецца ў склад Белзапалкаб'яднаньня;
е) торфавы завод «Міхаловічы», які ўключаецца ў склад Навукова - Дасьледчага Інстытуту Прамысловасьці.

5. Знаходзяцца пад ведамам Савету Народных Камісараў БССР і ўваходзяць у сыстэму Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці СССР наступныя гаспадарчыя арганізацыі:

А. Белторфаб'яднаньне ў складзе:
а) торфавага заводу «Бальшавік»,
б) торфавага заводу «Даўмана»,
в) торфавага заводу «Закрашынскі мох»,
г) торфавага заводу «Чырвоная Беларусь»,
д) торфавага заводу «Чырвоны Сьцяг»,
е) торфавага заводу «1-га Мая»,
ж) торфавага заводу «Асінторф»,
з) торфавага заводу «Свабода»,
і) торфавага заводу «Шлях Сацыялізму»,
к) торфавага заводу «Смаляніч»,
л) торфавага заводу «Татарка».

Б. Белмэталяаб'яднаньне ў складзе:
а) Гомсельмаш,
б) Магілёўскага трубаліцейнага заводу,
в) заводу «Чырвоны Мэталіст»,
г) заводу «Імя Варашылава»,
д) заводу «Камунар»,
е) заводу «Імя Сталіна»,
ж) заводу «Рухавік Рэвалюцыі»,
з) дротацвіковы завод «Інтэрнацыянал»,
і) завод «Ударнік»,
к) акулярная фабрыка.

Пытаньне аб іншых прадпрыемствах, якія ўваходзяць у склад Белмэталяаб'яднаньня вырашыць дадаткова.

В. Аб'яднаньне «Будматэрыял» з усімі прадпрыемствамі, якія ўваходзяць у яго склад.

Г. Белгорпрамаб'яднаньне з усімі прадпрыемствамі, якія ўваходзяць у яго склад.

Д. Белэнэрга з усімі прадпрыемствамі, якія ўваходзяць у яго склад.

Е. Белгэаразьведка з усімі прадпрыемствамі, якія ўваходзяць у яго склад.

Ж. Беларускае Геодэзічнае Кіраўніцтва.

З. Аб'яднаньне «Ўстаноўка».

6. Перадаць пад ведама Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці СССР з беспасрэдным падпарадкаваньнем іх адпаведным саюзным аб'яднаньням наступныя прадпрыемствы:

а) цэментавы завод,
б) сераўглеродны завод,
в) Крычаўскі цэментны завод, уключаючы торфавыя заводы «Вялікі Мох» і «Калектыўная Праца».
г) Клімавіцкі фасфарытны завод,
д) Крычаўскі фасфарытны завод,
е) Магілёўскую фабрыку штучнага валакна, уключаючы торфавы завод Грэбенева.

7. Уваходзяць у сыстэму Народнага Камісарыяту Лясной Прамысловасьці СССР наступныя гаспадарчыя арганізацыі:

а) Лесбел,
б) Белдрэў,
в) Белхімлес,
г) Белтапертрэст,
д) Трэст па сплаве,
е) Лесаснабзбыт.

8. Агульнае плянаваньне сьтварэньня і капітальнага будаўніцтва ў адносінах да гаспадарчых арганізацый, паказаных у арт. арт. 5 і 7 гэтай пастановы, ажыцьцяўляецца Народнымі Камісарыятамі Цяжкай і Лясной Прамысловасьці СССР праз сваіх упаўнаважаных пры СНК БССР.

Для ажыцьцяўленьня паказаных функцый пры Упаўнаважаных утвараецца адпаведны апарат.

9. У частцы кіраваньня прадпрыемствамі, паказанымі ў артыкулах 6 і 7 гэтай пастановы, Упаўнаважаныя Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці і Народнага Камісарыяту Лясной Прамысловасьці падпарадкоўваюцца беспасрэдна Народнаму Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці і Народнаму Камісарыяту Лясной Прамысловасьці, а ў частцы кіраваньня рэспубліканскай прамысловасьцю, якая ўваходзіць у сыстэму Цяжкай і Лясной Прамысловасьці, Упаўнаважаныя падпарадкоўваюцца беспасрэдна СНК БССР.

10. Перадаць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці СССР пры СНК БССР наступныя навучальныя ўстановы:

а) Мэханічна-машына-будаўнічы Інстытут—Гомель,
б) Энэргетычны Інстытут—Менск,
в) Торфавы Інстытут—Менск,
г) Энэргетычны Тэхнікум—Віцебск,
д) Мэханічны Тэхнікум—Віцебск,
е) Індустрыяльна-Інструктарскі Тэхнікум—Гомель,
ж) Торфавы Тэхнікум—Менск,
з) Вячэрні Мэханічны Тэхнікум—Віцебск,
і) Вячэрні Энэргетычны Тэхнікум—Віцебск,
к) Вячэрні Рабочы Тэхнікум—Гомель,
л) Рабфак пры Торфавым Інстытуце—Менск,
м) Рабфак пры Мэханічным Інстытуце—Гомель,
н) Рабфак пры Энэргетычным Інстытуце—Асінаўка,
о) Вячэрні рабфак пры Торфавым Інстытуце—Магілёў,
п) Вячэрні рабфак пры Мэханічным Інстытуце—Гомель,
р) Вячэрні рабфак пры Энэргетычным Інстытуце—Ворша,
с) Вячэрні рабфак пры Энэргетычным Інстытуце—Віцебск.

11. Перадаць пад ведама Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Лясной Прамысловасьці СССР пры СНК БССР усе навукова-дасьледчыя і навучальныя ўстановы, якія ўваходзілі раней у Беллеспром, а таксама перадаць яму Вячэрні Рабфак пры Хімічна-Тэхналёгічным Інстытуце ў Добруш.

12. Лічыць патрэбным арганізаваць у сыстэме Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Лясной Прамысловасьці СССР пры СНК БССР рэспубліканскі трэст фанэрнай прамысловасьці.

13. Ускласьці на Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці СССР пры СНК БССР нагляд і рэгуляваньне дзейнасьцю прадстаўніцтваў і аддзяленьняў усесаюзных аб'яднаньняў Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці—Усесаюзнае Электрааб'яднаньне, Рэмантрэст, Мэталялом і г. д.

14. Абавязаць Народны Камісарыят Лёгкай Прамысловасьці БССР у двухдзяковы тэрмін скончыць рэарганізацыю і вылучэньне прадпрыемстваў, паказаных у арт. 5 і 6 гэтай пастановы Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Цяжкай Прамысловасьці СССР пры СНК БССР па балянсе на 1 студзеня 1932 г. з усімі асыгнаваньнямі, прадугледжанымі кантрольнымі лічбамі на 1932 г.

15. Абавязаць Народны Камісарыят Лёгкай Прамысловасьці БССР на працягу дзьвюх дзякад падаць палажэньне аб Народным Камісарыяце.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарнякоў.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гілякевіч.

3 красавіка 1932 г.
г. Менск.

Пра мерапрыемствы для захаваньня маладняка буйнай рагатай жывёлы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Рост пагалоўя буйнай рагатай жывёлы залежыць ад захаваньня і правільнага выросьліваньня цялят. Між тым, у апошні час наглядаецца значны забой і падзёж маладняка, што стварае пагрозу невыкананьня аднае з важнейшых задач — пашырэньня статку жывёлы.

Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць, што ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1933 г. абавязкова павінна быць вырашчана 430 ТЫС. ЦЯЛЯТ, з якіх у саўгасах — 17,6 тыс., у прыгарадных гаспадарках Белкаапсаюзу — 1 тыс. цялят, у калгасах і калгаснікаў —250 тыс., у адналасобных гаспадарках—151,4 тыс.

Абавязаць Н. К. ЗЕМЛЯРОБСТВА, БЕЛКАЛГАСЦЭНТР і РАЁННЫЯ ВЫКАНАЎЧЫЯ КАМІТЭТЫ давесьці заданьне па захаваньні і выросьліваньні маладняка да паасобных саўгасаў, калгасаў і вёсак не пазьней 10 красавіка.

2. Для забясьпечаньня выкананьня гэтага пляну:

а) ЗАБАРАНІЦЬ ЗАБОЙ ЦЁЛАК, апроч няпрыгодных для гадоўлі па пасьведчаньні ветэрынарнага доктара.

Мясазагатоўчыя арганізацыі павінны ПРЫМАЦЬ на свае пункты ЦЁЛАК ДЛЯ ЗАБОЮ на мяса ТОЛЬКІ ПА ПАСЬВЕДЧАНЬНІ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ аб дазволе продажу на забой і няпрыгоднасьці іх для гадоўлі. За выкананьне пляну выросьліваньня маладняку ў саўгасах, саўгастрэстах і фэрмах Белкаапсаюзу нясуць адказнасьць дырэктары гэтых саўгасаў і фэрм;.

б) бычкоў на выросьліваньне саўгасы павінны пакідаць 15 проц. агульнага ліку цялят (цёлак і бычкоў) ацёлу 1932 г., калгасы і калгаснікі—25 проц. агульнага ліку цялят ацёлу 1932 г., пакідаючы на выросьліваньне ў першую чаргу бычкоў ад высокапрадукцыйных, чыстапародных і мэтызаваных кароў, аднаасобнікі—захаваць толькі ўсіх бычкоў ад высокапрадукцыйных кароў.

3. Правесьці КАНТРАКТАЦЫЮ ЦЁЛАК І БЫЧКОЎ на выросьліваньне: у калгаснікаў (па неаграмаджаным статку) усіх цялят, прыгодных для выросьліваньня (усіх цёлак і бычкоў у размеры, вызначаным п. «б», арт. 2)., у аднаасобнікаў ня менш 60.000 штук, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкуп раз кантрактацыю і абмен цёлак ад кароў жыхароў гарадоў і мястэчак, у якіх каровы значна большай прадукцыйнасьці.

Уся работа па кантрактацыі цялят як у калгаснікаў, так і аднаасобнікаў павінна праводзіцца на падставе разгортваньня шырокай масавай работы і стварэньня матарыяльных стымулёў, для заахвочваньня гадоўлі маладняка.

Трэба СПЫНІЦЬ УСЯКІЯ СПРОБЫ ПРЫМУСОВАГА АГРАМАДЖАНЬНЯ КАРОЎ І ДРОБНАЙ ЖЫВЁЛЫ ў калгаснікаў, прыцягваючы вінаватых да строгай адказнасьці, і арганізаваць дапамогу і садзейнічаньне калгаснікам, якія ня маюць каровы, у куплі і выросьліваньні маладняка для сваіх уласных патрэб.

Даручыць раённым выканаўчым камітэтам весьці самую рашучую барацьбу з элементамі адміністраваньня пры правядзеньні кантрактацыі.

4. Правядзеньне кантрактацыі ўскласьці на БЕЛКАЛГАСЦЭНТР, абавязаўшы яго скончыць усю работу па кантрактацыі да 20 красавіка. Закант рактаваны маладняк пры здачы павінен мець ня менш 3 месяцаў.

5. Кантрактацыю маладняка праводзіць як авансавую, так і безавансавую. Абавязаць Беларускую кантору Дзяржбанку і Н. К. Земляробства НА ПРАЦЯГУ 2-х ДЗЁН УСТАНАВІЦЬ РАЗЬМЕР АВАНСУ і патрэбнай для кантрактацыі сумы сродкаў і забясьпечыць фінансаваньне гэтага мерапрыемства за лік вытворчых крэдытаў па жывёлагадоўлі.

6. Устанавіць, што пры здачы закантрактаванага маладняка, ДА 20 проц. яго кошту выдаецца прамысловымі таварамі.

Абавязаць Н.К Снабжэньня па ўзгадненьні з Н.К Земляробства выдзяліць патрэбны для гэтага фонд прамысловых тавараў.

7. Абавязаць Белкалгасцэнтр забясьпечыць дагаворамі атрыманьне ад кантрактантаў добравыгадаванага маладняка.

8. Даручыць Н. К. Снабжэньня разам з Н. К. Земляробства па працягу трох дзён скласьці плян загатовак бычкоў з тым, каб гэты плян уключыць у лік цэнтралізаванага пляну мясазагатовак.

9. ЗА НЕЗАКОННЫ ЗАБОЙ маладняка (п.п. «а» і «б» арт. 2) у аграмаджаным сэктары (саўгасы і калгасы), а таксама за наўмыснае пакалечаньне ці прывядзеньне маладняка ў няпрыгоднае для гадоўлі становішча вінаватыя ПРЫЦЯГВАЮЦЦА ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ як за зрыў важнейшай гаспадарча - палітычнай задачы.

За тыя-ж самыя дзеяньні, зробленыя аднаасобнікамі і калгаснікамі (па лініі неаграмаджанага статку), на вінаватых накладаецца раённымі выканаўчымі камітэтамі штраф у разьмеры да дзесяціразовага кошту забітага ці пакалечанага пяляці па мясцовых загатоўчых цэнах.

У КУЛАКОЎ І ГАНДЛЯРОЎ, якія самі зрабілі злачынныя дзеяньні ці падбухторвалі да гэтага іншых раёны выканаўчы камітэт можа апроч таго КАНФІСКАВАЦЬ УСЮ ІХ ЖЫВЁЛУ ці частку яе.

10. Абавязаць РАЁННЫЯ ВЫКАНАЎЧЫЯ КАМІТЭТЫ І ГАРАДЗКІЯ САВЕТЫ, ПАД АСАБІСТУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ІХ СТАРШЫНЬ, ЗАХАВАН НЕ МАЛАДНЯКА ЎЗЯЦЬ ПАД АСОБНЫ НАГЛЯД, праверыць давядзеньне заданьняў па гадоўлі да паасобных саўгасаў, калгасаў і вёсак і ўстанавіць кантроль за выкананьнем іх, на працягу 2-х дзякад правесьці сусцэльную праверку ў калгасах і саўгасах становішча дагляду і ўтрыманьня маладняка ўсіх відаў жывёлы (забясьпечаньне адпаведнымі памяшканьнямі, падсьцілкай, правільнасьць кармленьня, забясьпечаньне кармамі), правільнасьць арганізацыі працы і аплаты яе, ажыцьцяўленьня прэм'яваньня рабочых саўгасаў і калгаснікаў за лепшае ўтрыманьне, зьнікненьня падзяжу і захаваньня маладняка; павесьці самую рашучую барацьбу з бесгаспадарчасьцю і нядбайнымі адносінамі да выкананьня пэрсаналам сваіх абавязкаў і праз узмацненьне практычнай канкрэтнай работы стварыць пералом у справе захаваньня маладняка.

11. Абвясьціць ДВУХМЕСЯЧНІК ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЗЛУЧНАЙ КАМПАНІІ і барацьбы за захаваньне маладняка. Тэрмін двухмесячніка ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Земляробства.

12. З выданьнем гэтае пастановы ка суюцца ўсе раней выданыя пастановы СНК і РВК, якія супярэчаць гэтай.

13. Даручыць усім раённым выканаўчым камітэтам скасаваць свае пастановы пра забарону забою маладняка, якія супярэчаць гэтай пастанове.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

8 красавіка 1932 г.
г. Менск.
№ 165.

Па БССР

Бальшавіцкай падрыхтоўкай да сяўбы адказваюць калгасьнікі на рэарганізацыю раёну

Койданава. (Па тэлеф. ад нашага спэцкора). У Койданаўскім раёне шырока разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў. Гэта кампанія выклікала вялікую зацікаўленасьць з боку калгасьнікаў, беднякоў, і сераднякоў-аднаасобнікаў.

Па 13 выбарчых вучасткох Байдацкага сельсавету праведзены сходы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, дзе абгаварвалася пастанова ЦВК БССР аб рэарганізацыі Койданаўскага раёну ў нацыянальна-польскі.

Удзельнікі гэтых сходаў шчыра віталі ўрад, які няўхільна ажыцьцяўляе ленінскую нацыянальную палітыку.

Праведзена два справаздачных сходы Ціснаўскага і Цалкаўскага сельсаветаў, на якіх прысутнічала 87 проц. выбаршчыкаў.

Кампанія перавыбараў саветаў пе на ўвязваецца з усімі іншымі гаспадарча-палітычнымі задачамі. У сувязі з перавыбарамі саветаў, калгас «Прагрэс» скончыў падрыхтоўку да веснавой сяўбы, адрамантаваў інвэнтар, транспарт, конскую абрую. На чэ сяўбы цягавая сіла забясьпечана кармамі. 5-IY праведзены пробны выезд у поле. Калгаснікі паказалі сваю поўную падрыхтаванасьць да трэцяй бальшавіцкай вясны. Калгаснікі прыступілі да праверкі выкананьня сацумовы з калгасам «Расьсьвет» на лепшую падрыхтоўку да сяўбы. Калгасы «Расьсьвет» і «Іскра» таксама поўнасьцю забясьпечаны кармамі і зараз аказваюць сацыялістычную дапамогу суседнім калгасам. Калгас «Расьсьвет» узяў на пракармленьне 10 кароў з калгасу «Новае Жыцьцё» і перадаў 70 тон сілосу калгасу імя Будзёнага.

Шырока разгарнулася работа па мабілізацыі ўнутраных кармовых рэсурсаў. На сёньняшні дзень ужо сабрана 600 пуд. саломы.

Маркаў.

Фабрыка „Уцільскур" датэрмінова выканала прамфінплян першага кварталу

Партячэйка, дырэкцыя і фабком фабрыкі «Уцільскур» прыслалі Менгарыкому КП(б)Б, Гарсавету і Гарпрафсавету рапарт аб датэрміновым выкананьні фабрыкай прамфінпляну першага кварталу. У рапарце гаворыцца наступнае:

«Пад правільным кіраўніцтвам партыі, яе ленінскага ЦК і мясцовай партыйнай арганізацыі, ажыцьцяўляючы 6 гістарычных умоў т. Сталіна практыцы, фабрыка «Уцільскур» датэрмінова скончыла прамфінплян кварталу 4-га заключнага году пяцігодкі 23-III.

Рабочы калектыў з яшчэ большай энэргіяй узяўся за выкананьне прамфінпляну другога кварталу на кольтыйнай арганізацыі, ажыцьцяўляючы касных і якасных паказчыках».

Папраўка

У пастанове ЦВК і СНК БССР аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Койданаўскага раёну («Савецкая Беларусь» за 3-IV-32 г., № 75) памылкова надрукавана: «Баваўскі сельскі савет» трэба — «Бараўскі нацыянальны польскі сельскі савет».

У арт. 11 замест «Заросьсе»—трэба «Зарослае»; пачатак арт. 15 трэба чытаць: «Койданаўскі местачковы савет у складзе мястэчка Койданава і наступных вёсак...».

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе, што 10 красавіка, а 5 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК КП(б)Б (пакой № 14) адбудзецца нарада па тэхпрапагандзе. На нараду выклікаюцца загадчыкі і інструктары па тэхпрапагандзе ўсіх наркаматаў і гаспадарчых аб'яднаньняў (партыйцы), заг. сэктароў тэхпрапаганды ЦСПСБ і ЦП прафсаюзаў, гарпрафсаюзаў і ЦК ЛКСМБ, ГК КП(б)Б і прадстаўнікі цэнтральных газэт. ПАРАДАК ДНЯ:

1. Інфармацыя сэктароў тэхпрапаганды наркаматаў і аб'яднаньняў аб выніку м-ка агляду тэхпрапаганды.
2. Аб мерапрыемствах па рэалізацыі рашэньняў сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б у галіне тэхпрапаганды.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б
ЧАРНУШЭВІЧ.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

11 красавіка г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшк. Дому Камасьветы (рог вул. К. Маркса і Энгельса)

СКЛІКАЕЦЦА

ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ

ПАРАДАК ДНЯ:

Вынікі выкананьня прамфінпляну за першы квартал

(Даклады Мэталяаб'яднаньня, Скураб'яднаньня, Швэйаб'яднаньня і Наркамснабу).

На сход партактыву запрашаюцца: трохкутнікі прадпрыемстваў і гаспадарчых устаноў і арганізацый, фракцыі ЦП прафсаюзаў, сакратары цэхячэек, групоргі і парторгі, загадчыкі цэхаў і майстры (камуністы).

Сакратарам калектываў і ячэек КП(б)Б належыць атрымаць білеты на сход партактыву ў Гаркоме КП(б)Б (пакой № 10) 10 і 11 красавіка з 9 гадзін раніцы да 4 гадз. дня.

Члены ЦК і ЦКК, Гаркому і ГарКК КП(б)Б праходзяць на сход партактыву па сваіх мандатах.

Менгарком КП(б)Б

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	Замежны фільм Я ВОЛЬНЫ
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	ДУГЛАС ФЭРБЭНКС у карціне СЫН ЗОРА
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	Чалавек з рэстарану

Згодна пастановы Белбудкалгасцэнтру, пры Віцебскім Райкалгасбудвучастку АДЧЫНЕН БУДДВОР міжраённага значэньня пры калгасе Чарвякова, ст. Княжыца, Віцебскага сельсавету,

ЯКІ БУДЗЕ ВЫРАБЛЯЦЬ наступны мясцовы БУДМАТАР'ЯЛ:

гонты, шчапу, саламітныя каўры для сьцен і даху, ганчарную чарапіцу, а таксама будзе прымаць заказы на выраб вакон, дзьвярэй і інш. патрэбнае для калгаснага будаўніцтва.

Заказы будуць прымацца ў першую чаргу ад калгасаў ня толькі Віцебскага раёну, але і іншых раёнаў.

Па ўсіх пытаньнях і заключэньні ўмоў трэба зварочвацца да Буддвара, ст. Княжыца, Віцебскага сельсавету, да загадчыка Буддвара тав. БАКЛАНАВА

Віцрайкалгасбудвучастак

Беларуская Кантора Дзяржаўнага Ўсесаюзнага Вэ эрынарна-Эпізоатычнага Трэсту „ВЭТ"

ЛІКВІДУЕЦЦА з 1-га красавіка 1932 г.

Усе дзяржа ныя, каапэрацыйныя, грамадзкія арганізацыі і іншыя асобы, маючыя прэтэнзіі да Белканторы „ВЭТ", абавязаны прад'явіць іх ліквідкому Белканторы „ВЭТ" не пазьней 20-IV г. г, пасьля чаго, ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць

Адрас ліквідкому: Менск, Беларуская вуліца № 24, тэлефон № 4-60

У дадатак да аб'явы, зьмешчанай у газэце „Савецкая Беларусь" ад 24-IX—1-X 1931 г.,

Менскі раён БЕЛТРАНСЛЕСА (Севбелтранслеса)

паведамляе ўсіх зацікаўленых асоб і прадпрыемствы, што

ліквідацыя апошняга заканчваецца 15-га КРАСАВІКА 1932 г.,

пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць

Ліквідком

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 55

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

пра ўпарадкаваньне тара-ўпаковачнай гаспадаркі гораду Менску

У адпаведнасьці з пастановай Эканомнарады пры СНК БССР ад 16-XI 1930 г. і пастановай СПА СССР ад 8-V 1931 г., пастановы 233 „пра ўпарадкаваньне тара-ўпаковачнай гаспадаркі і ўліку тары" Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Абавязаць усе дзяржаўныя, каапэрацыйныя, грамадзкія арганізацыі, установы і прадпрыемствы г. Менску зварочваць па прызначэньню ўсю без выключэньня паступаючую да іх тару як драўляную, так і рагожна-кулявую, строга прытрымліваючыся ўстаноўленага ніжэй парадку:

I. Па драўлянай тары (скрынкі, бочкі і інш.).

2. Уся тара, якая абарочваецца ў выглядзе тары-інвэнтара і разборна-складзкой тары, належыць абавязковаму звароту непасрэдна тым прадпрыемствам, ад якіх яна паступіла, альбо па ўказаньні апошніх іншым прадпрыемствам.

Уся іншая тара (апрача тары-інвэнтара і разборна-складзкой тары) належыць здачы Менскай рамонтнай базе «Саюзтара».

3. Абавязаць усе арганізацыі, якія здаюць тару на Менскую рамонтную базу ў адпаведнасьці з п. 1 пастановы, заключыць з рамонтнай базай да 10 красавіка 1932 г. умовы на здачу тары, якая ашабляецца з-пад тавараў.

Разам з тарай належыць звароту ўся тарная арматура: цьвікі, дрот і абручнае жалезо.

4. Драўляная тара павінна быць зьвернута на Менскую базу «Саюзтара» ў 3-хдзённы тэрмін са дня яе ашабленьня.

5. Абавязаць загадчыкаў магазынаў, заг. складамі, сталовымі, буфетамі і інш. усёй гандлёвай сеці Менскага раёну беражліва адносіцца да тары, зьвяртаць яе на базу ў незабрудзканым выглядзе, мець належныя інструманты для ўскрыцьця тары і папярэдніць магчымасьці псаваньня тары за тэрмін хаваньня, ускрыцьця, пагрузкі, выгрузкі і перавозкі.

II. Па рагожна кулявой тары

6. Ашабляемая з-пад тавараў рагожна-кулявая тара і пакматар'ялы (радніна з-пад тэкстыля), патрабуючая рамонту, а таксама мачальная рвань (уціль) належыць абавязковай здачы на рамонтна-кулявую базу ў Менску і прыёмна-загатоўчыя пункты Белкапінсаюзу

7. Даручыць Белкапінсаюзу ў месячны тэрмін забясьпечыць пашырэньне сеткі прыёму загатоўчых пунктаў у мэтах поўнага ахопу ўсёй дзяржаўнай тары па горадзе.

8. Абавязаць прадпрыемствы і арганізацыі ўстанавіць пільны ўлік тары як новай, так і старай, драўлянай і рагожна-кулявой.

9. Абавязаць кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, якія атрымліваюць і здаюць тару на рамонтную базу, вылучыць у 5-цідзённы тэрмін адказных асоб па тары, з ускладаньнем на іх пэрсанальнай адказнасьці на выкананьні гэтай пастановы.

10. Устанавіць прэм'яваньне загадчыкаў магазынаў, загадчыкаў складамі, работнікаў прылаўкаў за беражліваю адносіны да тары і яе своечасовай здачы ў прыгодным для далейшага спажываньня выглядзе, стварыўшы для гэтага прэміявальны фонды.

11. Даручыць кіраўніку Беларускага аддзяленьня «Саюзтара» т. Ганцэвічу і Гарспабу т. Гантману сумесна з прадстаўнікамі Белкаапсаюзу, Белгандлю, з прыцягненьнем актыву прылаўку, у 2-хдзённы тэрмін устанавіць парадак стварэньня прэміявальных фондаў і канкрэтных паказьнікаў і ўмовы прэміяваньня.

12. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на Гарспаб.

13. Вінаватыя ў парушэньні п. 1, 2, 3, 4, 5 і 7 гэтай пастановы, прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасьці—штрафу да 100 руб., або да 2-х тыдняў прымусовай працы.

Асобы, вінаватыя ў сыстэматычным і злосным парушэньні, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

14. Гэтая пастанова набывае моц са дня абвяшчэньня.

Старшыня Менгарсавету ВАЛОДЗЬКА
Сакратар ЛЮЦЬКО

РАЗЬВЁРСТКА

на вясеньні набор (з 1-IV—15-V 1932 году) у Завочны Камвуз (Менск), і радыё-курсы райпартактыву

Раёны	ЗКУ	Радыё-курсы	Раёны	ЗКУ	Радыё курсы	Раёны	ЗКУ	Радыё-курсы
Асьвейскі	5	5	Бярэзінскі	6	6	Вузьдзенскі	6	6
Вушацкі	7	7	Веткаўскі	8	8	Чырвона-Слабодзкі	7	7
Бешэнковіцкі	6	6	Жлобінскі	25	25	Гомельскі	100	100
Бялыніцкі	7	7	Клічаўскі	7	7	Менскі	100	100
Горацкі	20	20	Кармянскі	10	10	Аршанскі	50	50
Гарадоцкі	10	10	Касьцюковіцкі	10	10	Барысаўскі	50	50
Дубровенскі	8	8	Клімавіцкі	15	15	Бабруйскі	50	50
Дрысенскі	15	15	Чырвона-польскі	6	6	Рэчыцкі	30	30
Крупскі	7	7	Крычаўскі	10	10	Брагінскі	7	7
Лёзьненскі	10	10	Прапойскі	6	6	Глускі	8	8
Лепельскі	12	12	Пухавіцкі	10	10	Камарынскі	5	5
Мсьціслаўскі	10	10	Рагачэўскі	15	15	Ельскі	7	7
Полацкі	50	50	Слуцкі	15	15	Лоеўскі	5	5
Расонскі	6	6	Стара-Дароскі	5	5	Любаньскі	7	7
Сіроцінскі	7	7	Смаляніцкі	8	8	Мазырскі	30	30
Сураскі	8	8	Уваравіцкі	10	10	Нараўлянскі	5	5
Сеньненскі	8	8	Церахоўскі	8	8	Парыцкі	5	5
Талачынскі	12	12	Чачэрскі	10	10	Петрыкаўскі	15	15
Чаўскі	8	8	Чэрвеньскі	10	10	Хойніцкі	10	10
Чашніцкі	10	10	Чэрыкаўскі	6	6	Старобінскі	6	6
Шклоўскі	15	15	Быхаўскі	10	10	Жыткавіцкі	8	8
Віцебскі	100	100	Заслаўскі	6	5	Тураўскі	7	7
Магілёўскі	50	50	Капыльскі	10	10	Лельчыцкі	7	7
Асіпавіцкі	15	15	Койданаўскі	25	25			
Буда-Кашалёўскі	5	5	Лагойскі	5	5			
Быхаўскі	15	15	Плешчаніцкі	7	7	Усяго	1215	1215

Дырэктар ІМЗН пры ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

27-га лютага 1932 г. Народным Камісарыятам Фінансаў БССР на падставе арт. 2-4 Палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8